Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניגט אייך!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СУБОТА
18 ліпеня 1931 г.
№ 163 (3252)

Ні аднаго цэнтнера хлеба прыватніку!

Аб арганізацыі хлебазагатовак у кампанію 1931-32 г.

(Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 15 ліпеня 1931 г.)

ЦК УсеКП(б) зварочвае ўвагу ўсіх партыйных арганізацый на выключную важнасьць пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак у гэтым годзе як у сацыялістычным, так і ў індывідуальным сэктарах сельскай гаспадаркі. Рашаючыя перамогі калектывізацыі, рост саўгасаў і МТС, высокі процант таварнай прадукцыі ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі ствараюць усе магчымасьці для хуткага выкананьня пляну хлебазагатовак і адначасовага вывазу хлеба да прыстанцыйных пунктаў і элеватараў. Галоўнае, чаго павінны дабіцца органы Наркамснабу, сельгаскаапэрацыя і мясцовыя партарганізацыі ў хлебазагатоўках гэтага году,—гэта не дапушчаць разрыву паміж загатоўкамі і вывазам, дабіцца адзінства загатовак і вывазу хлеба. Усе партарганізацыі і, ў асаблівасьці, хлебазагатоўчыя органы павінны цьвёрда ўсвоіць, што толькі той хлеб можа лічыцца загатоўленым, які не засеў у так званых глыбінных пунктах, які падвезены да прыстанцыйных пунктаў, элеватараў і млыноў.

Уся работа па хлебазагатоўках павінна быць арганізавана так, каб поўнасьцю скончыць загатоўку хлеба і вываз яго на прыстанцыйныя пункты па паўднёвых і паўднёва-ўсходніх раёнах не пазьней 10-15 студзеня, а па паўночных і паўночна-ўсходніх — не пазьней 10-15 лютага.

ЦК прапануе, поруч з работай па ўмацаваньні хлебазагатоўчага апарату, неадкладна заняцца падрыхтоўкай і арганізацыяй транспартных сродкаў для хуткага і пасьпяховага перавозу хлеба (максымальнае скарыстаньне як гужавога, так і аўтатранспарту), не ствараючы ніякіх складаў у так званых глыбінных пунктах, за выключэньнем асоба аддаленых раёнаў, сьпіс якіх зацьвярджаецца Наркамснабам.

Павінна быць палепшана ўся работа па транспартоўцы хлеба да прыстанцыйных пунктаў, элеватараў, млыноў. Па лініі чыгункі павінны быць зьнішчаны сустрэчныя перавозкі, устаноўлена пэрсанальная адказнасьць загадчыкаў элеватараў, млынамі і ссыпнымі пунктамі за простай вагонаў, наладжана за бесьпячэньне тарай і прыведзены ў парадак пад'яздныя шляхі да элеватараў і млыноў. З свайго боку НКШЗ павінен забясьпечыць неабходную колькасьць вагонаў для пагрузкі хлеба, забясьпечыць пункты пагрузкі рабочай сілай і ўсімі неабходнымі для пагрузкі зерня насыпкай матар'ялямі, шчытамі і гэтак далей.

У сувязі з павялічэньнем перавозкі хлеба выключна важнае значэньне набывае работа прыстанцыйных пунктаў, элеватараў і млыноў Саюзхлеба.

ЦК абавязвае НКснаб і мясцовыя арганізацыі праверыць работу і настаноўку справы ўсіх прыстанцыйных пунктаў і элеватараў з тым, каб былі рашуча зьнішчаны факты бюракратычных адносін да здатчыкаў хлеба, ліквідаваны чаргі і павялічана прапускная здольнасьць гэтых пунктаў. У мэтах павялічэньня колькасьці пунктаў расплаты з здатчыкамі хлеба прызнаць неабходнай арганізацыю прыпісных кас Дзяржбанку ў прыстанцыйных пунктах агульнай колькасьцю да 1.500.

ЦК абавязвае Наркамснаб і мясцовыя партыйныя арганізацыі прыняць усе неабходныя меры для сваячасовага сканчэньня новага элеватарна-складзкога будаўніцтва і рамонту хлебных складаў.

Для пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак, а значыцца, і вывазу хлеба, у кожным сельсавеце зярнёвых раёнаў павінны быць вылучаны ўпаўнаважныя Хлебажывцэнтру па загатоўках. У калгасах, а таксама ў раёнах МТС павінен быць вылучан спэцыяльны член праўленьня або адзін з намесьнікаў дырэктара МТС, які вядзе ўсю практычную работу па здачы хлеба, забесьпячэньні хуткай яго перавозкі, збору тары, уліку абмалочанага і здаванага хлеба і г. д. Гэта ня здымае адказнасьці за сваячасовую і поўную здачу хлеба на пляну з праўленьня калгасу і дырэктара МТС.

Для пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак павінна, па прыкладу ранейшых год, праводзіцца шырокая масавая работа сярод калгасьнікаў, бяднаты і сераднякоў-аднаасобнікаў за хутчэйшую здачу хлеба дзяржаве, за ажыцьцяўленьне лёзунгу—«ніводнага цэнтнера хлеба прыватніку». Гэтай задачы павінна быць падпарадкавана ўся работа хат-чытальняў і чырвоных куткоў, гэтая работа—баявая задача савету культурнага будаўніцтва пры сельсавеце.

«Для пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак павінна, па прыкладзе ранейшых год, праводзіцца шырокая масавая работа сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас і павінны быць арганізаваны камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам пры сельсаветах для дапамогі ў справе пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак і вывазу хлеба, далейшага ўцягненьня бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы і ліквідацыі кулацтва як клясы». (З пастановы ЦК УсеКП(б).

Пры сельскіх саветах трэба неадкладна арганізаваць камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам, куды вылучыць найбольш актыўных членаў сельскіх саветаў, аб'яднаць вакол яе ўвесь савецкі актыў. Уцягнуць у справу хлебазагатовак актывістаў-калгасьнікаў, жандэлегатак і інш., арганізаваць выпрабаваны мэтад бальшавіцкай работы—сацспаборніцтва, сустрэчныя пляны, грамадзкі буксір. Непарыўная лава чырвоных абозаў павінна быць вынікам другой бальшавіцкай уборкі.

Але-ж прыняць хлеб яшчэ не абазначае скančэньне загатовак.

«Усе партарганізацыі і, асабліва, хлебазагатоўчыя органы павінны цьвёрда ўсвоіць, што толькі той хлеб можа лічыцца загатоўленым, які не затрымаўся ў так званых глыбінных пунктах, які падвезены да прыстанцыйных пунктаў, элеватараў і млыноў» (Паст. ЦК УсеКП(б)).

Апроч таго, трэба арганізаваць работу так, каб загатоўлены хлеб быў сваячасова захаваны і перапрацаваны, згодна пляну забясьпечаньня і дзяржаўнага экспорту, рашучым чынам унікаючы сустрэчных перавозак. Саветы, сэкцыі РСІ павінны самым рашучым чынам выкрываць выпадкі сустрэчных перавозак, моманты несваячасовай прыёмкі хлеба, бюракратычных адносін да здатчыкаў хлеба. Неадкладна па-бальшавіцку выправіць хібы і дружнай работай дабіцца сваячасовага выкананьня плянаў хлебазагатовак.

Партарганізацыі, сельсаветы не павінны дапускаць недаацэнкі ролі аднаасобнага сэктару ў выкананьні плянаў хлебазагатовак, асабліва ў БССР, дзе калектывізацыя дасягае толькі 40 процантаў (ліпень) з усіх сялянскіх гаспадарак.

Хлебазагатоўчая кампанія—баявая задача сельсаветаў, якая будзе па ўдарнаму выкананая пры ўмове ніўхілнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, мабілізацыі ўсяго савецкага актыву вакол яе правядзеньня.

Хлебазагатоўкі—баявая задача саветаў

Публікуемая вышэй пастанова ЦК УсеКП(б) аб арганізацыі хлебазагатовак у кампаніі 1931-32 году мае ажэзарнейшае гаспадарча-палітычнае значэньне. Высунутыя ў ёй задачы па арганізацыі хлебазагатовак павінны зьявіцца асноўнымі зьвеньнямі ў штодзённай рабоце партыйных і савецкіх арганізацый.

Хлебазагатоўчая кампанія гэтага году будзе праходзіць ва ўмовах шырока разгорнутага калгаснага руху, у часе рашаючых перамог калектывізацыі, «рост саўгасаў і МТС, высокі процант таварнай прадукцыі ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі ствараюць магчымасьці для хуткага выкананьня пляну хлебазагатовак...» (З пастановы ЦК УсеКП(б)). У гэтым годзе хлебазагатоўчая кампанія пачынаецца і будзе праходзіць у значна больш спрыяючых умовах, чым летась, бо «калгаснае сялянства ўжо ператварылася ў цэнтральную фігуру земляробства» (Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б)).

Гэта зусім не азначае, што можна спадзявацца на самацёк, што можна супакоіцца. Такія разважаньні нічога агульнага з дырэктывамі партыі і ўраду ня маюць, менавіта зараз «хлебазагатоўкі трэба арганізаваць» (Сталін). Трэба цьвёрда памятаць, што хлебазагатоўкі будуць і ў гэтым годзе праходзіць пры абостраным клясавай барацьбе, што кулак усімі сродкамі будзе імкнуцца сарваць хлебазагатоўкі.

Было-б няправільным лічыць, што хлебазагатоўкі пачынаюцца толькі тады, калі пачнецца абмалот. Хлебазагатоўкі—неадымная частка барацьбы за бальшавіцкі ўраджай. Уборачную кампанію, да якой мы шчыльна падыходзім, трэба ўвязаць з пачаткам хлебазагатоўчай кампаніі. Ушчыльненьне тэрмінаў, правільная арганізацыя працы ў часе ўборкі павінны забясьпечыць хутчэйшы прыёмі хлеба ў дзяржаўна-кааперацыйныя склады.

Асабліва вялікая роля ў хлебазагатоўках сельскіх саветаў. Ужо ў часе ўборкі сельскія саветы павінны ўзяць на вучот усе кулацка-заможныя гаспадаркі, выявіць хлебныя лішкі і сваячасова ўручыць цьвёрдыя заданьні па здачы хлеба дзяржаве кулацкімі гаспадаркамі. Сельскія саветы, савет культурнага будаўніцтва павінны разгарнуць пад кіраўніцтвам мясцовых парт арганізацый шырокую масавую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў, бяднаты і сераднякоў-аднаасобнікаў за хутчэйшую здачу хлеба дзяржаве, за ажыцьцяўленьне лёзунгу—«ніводнага цэнтнера хлеба прыватніку». Гэтай задачы павінна быць падпарадкавана ўся работа хат-чытальняў і чырвоных куткоў, гэтая работа—баявая задача савету культурнага будаўніцтва пры сельсавеце.

«Для пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак павінна, па прыкладзе ранейшых год, праводзіцца шырокая масавая работа сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас і павінны быць арганізаваны камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам пры сельсаветах для дапамогі ў справе пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак і вывазу хлеба, далейшага ўцягненьня бядняцка-сераднякіх мас у калгасы і ліквідацыі кулацтва як клясы». (З пастановы ЦК УсеКП(б).

Пры сельскіх саветах трэба неадкладна арганізаваць камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам, куды вылучыць найбольш актыўных членаў сельскіх саветаў, аб'яднаць вакол яе ўвесь савецкі актыў. Уцягнуць у справу хлебазагатовак актывістаў-калгасьнікаў, жандэлегатак і інш., арганізаваць выпрабаваны мэтад бальшавіцкай работы—сацспаборніцтва, сустрэчныя пляны, грамадзкі буксір. Непарыўная лава чырвоных абозаў павінна быць вынікам другой бальшавіцкай уборкі.

Але-ж прыняць хлеб яшчэ не абазначае скančэньне загатовак.

«Усе партарганізацыі і, асабліва, хлебазагатоўчыя органы павінны цьвёрда ўсвоіць, што толькі той хлеб можа лічыцца загатоўленым, які не затрымаўся ў так званых глыбінных пунктах, які падвезены да прыстанцыйных пунктаў, элеватараў і млыноў» (Паст. ЦК УсеКП(б)).

Апроч таго, трэба арганізаваць работу так, каб загатоўлены хлеб быў сваячасова захаваны і перапрацаваны, згодна пляну забясьпечаньня і дзяржаўнага экспорту, рашучым чынам унікаючы сустрэчных перавозак. Саветы, сэкцыі РСІ павінны самым рашучым чынам выкрываць выпадкі сустрэчных перавозак, моманты несваячасовай прыёмкі хлеба, бюракратычных адносін да здатчыкаў хлеба. Неадкладна па-бальшавіцку выправіць

Раўнайцеся па калгасах імя Дзяржынскага і Варашылава!

Калгасьнікі польскіх нацыянальных калгасаў імя Дзяржынскага і імя Варашылава, Нарэйкаўскага с.-с., Койданаўскага р. паказалі высокую клясавую сьвядомасьць і бальшавіцкія тэмпы па мабілізацыі фінансавых сродкаў на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Яны ўнесьлі поўнасьцю і датэрмінова налічаны на іх сельска-гаспадарчы падатак на 1931 год, падпісаліся на пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі» і выклікаюць калгасы і калгасьнікаў усёй БССР пасьледваць іх прыкладу і стаць у рады ўдарнікаў фінансавага фронту.

Рэкстын.

ФІНАНСАВАЯ КАТАСТРОФА НЯМЕЧЧЫНЫ ПАШЫРАЕЦЦА

ПАНІКА НА УСІХ БІРЖАХ ЭУРАПЭЙСКІХ ДЗЯРЖАЎ

Банкіры Францыі патрабуюць ад Нямеччыны за „дапамогу" палітычных гарантый

У пошуках „выхаду" з фінансавай катастрофы

БЭРЛІН. 16-VII. Паводле паведамленьня «Фосіш Цэйтунг»—нямецкі ўрад абгаворвае пытаньне аб устанаўленьні дзяржаўнага кантролю над ўсімі буйнымі, банкаўскімі ўстановамі і аб назначэньні для іх спэцыяльных дзяржаўных камісараў.

У выніку краху Данатбанку, выкінуты на вуліцу 7.300 служачых, якія былі заняты да гэтага часу ва ўсіх аддзяленьнях гэтага банку. Крах Данатбанка прывёў да банкроцтва ці вельмі пахісную цэлы рад зьвязаных з ім банкаў і банкавых фірм.

Урадавыя мерапрыемствы паглыбляюць крызіс

БЭРЛІН, 16-VII. Дзеławыя колы, асабліва прадстаўнікі гандлю і прамысловасьці надзвычайна незадаволены ўрадавымі мерапрыемствамі.

Гэтыя колы стаяць на тым жа пункце гледжаньня, што падвышэньне вучотнага процанту і процанту па залогавых апэрацыях азначае далейшае звужаньне ахопу крэдытаў і вялізарнейшае ўздражаньне сабекошту, вынікам чаго будзе далейшае бурнае скарочаньне вытворчасьці.

„Рэвалюцыя і вайна нямінучы"

НЬЮ-ЁРК. 15-VII. Паводле паведамленьня з Вашынгтону намесьнік дзяржаўнага сакратара (таварыш міністра замежных спраў) Кэсль, заявіў, што хоць становішча ў Нямеччыне вельмі сур'ёзнае, але прапанова Гувэра папярэдзіла крах пляну Юнга і сусьветны крах. Вядомы фінансіст банкір, які абвінавачвае ў руку Францыю ў тым, што яна зацягнула перагаворы і гэтым зьвяла ні нішто выгоды, прадстаўляемыя прапановай Гувэра аб адтэрмінаваньні плацяжоў.

Сэнсацыйная бульварная газэта заяўляе, што калі ў Нямеччыне камунізм пераможа, дык Польшча будзе імкнуцца да таго, каб перашкодзіць аб'яднаньню СССР з Нямеччынай, а СССР раздушыць Польшчу.

Рэвалюцыя і вайна нямінучы, калі толькі Францыя не адмовіцца ад сваёй варожасьці з Нямеччынай і перастане не баяцца.

ЛЁНДАН. 16-V. Вінавайцу ўсіх бед у нямецкім крызісе ўся ангельская прэса аднадушна бачыць у Францыі. Галоўны інтарэс сёньня выклікае пытаньне аб тым, як нямецкі крызіс адаб'ецца на фінансавым становішчы Англіі.

На лёнданскай біржы пасьля працяг ваўшагася ў мінулыя дні спакойства, учора пачалося поўнае замяшаньне. Нясупынае выяўляцце замежных фондаў выклікала значнае зьніжэньне курсу фунта стэрлінгаў у адносінах да франка і доляра. Уцечка золата з Лёндану ўчора дасягнула амаль 3 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Уцечка золата адбываецца, галоўным чынам, за кошт французкіх укладчыкаў. На Нью-Ёрскай біржы курс фунта стэрлінгаў дасягнуў самага нізкага ўзроўню за ўвесь час пасьля пераходу гражданства зваротну на залатую базу ў 1925 годзе.

Рэйхсбанк напярэдадні банкроцтва

БЭРЛІН. 15-VII. Рэйхсбанк моцна звузіў прадстаўленьне лімітаў і ўлічвае толькі надзвычайна кароткатэрміновыя вэксалі. Фактычна гэта зводзіцца да таго, што рэйхсбанк здавальняе толькі 40-50 проц. прад'яўляемых да яго патрабаваньняў.

У выніку гэтага іншыя банкі, не атрымліваючы дастатковых крэдытаў ад рэйхсбанку, прымушаны для атрыманьня грошай прадаваць рэйхсбанку валюту, з прычыны чаго валютны запас рэйхсбанку за апошнія 2 дні павялічыўся.

Банкроцтвы прадпрыемстваў у Нямеччыне

БЭРЛІН, 15-7. Дырэкцыя заводу Круппа агаласіла паведамленьне аб закрыцьці прадпрыемстваў у Рэйнхаузе.

Аб'яднаньне машынабудаўнічых заводаў паведамляе аб далейшым скарачэньні прадукцыі машынабудаўнічай прамысловасьці. Пакупка машынабудаўнічых заводаў складае толькі 43 проц.

Ангельскі пралетарыят выказвае сваю гатоўнасьць падтрымаць нямецкую рэвалюцыю

ЛЁНДАН. 16-VII. Палітбюро ангельскай кампартыі зьвярнулася ад імя ангельскіх рабочых з прыпытаньнем да нямецкіх пралетарскіх мас і іх правадыра — нямецкай кампартыі.

«Ангельскія рабочыя — гаворыцца ў лісьце, усім сэрцам усхрыймаюць вашу барацьбу, як сваю ўласную барацьбу. У з самым жывым інтарэсам сочаць за ростам гаспадарчага крызісу Нямеччыны бяруць на сябе абавязацельства змагацца рука ў руку з вамі супроць фашызму, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне нямецкага народу і зьвяржэньне ўлады клясы капіталістаў». У лісьце зазначаецца, што крызіс капіталізму стаіць у яскравым кантрасьце з ростам сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе.

Палітбюро прадоўжвае: «на нашу думку, лепшай дапамогай нямецкім масам у гэтыя гістарычныя дні крызісу будзе ўзмацненьне нашай барацьбы супроць уласнай клясы капіталістаў і лейбарысцкага ўраду. Зазначаючы на стачкі, што адбываюцца зараз у Англіі, палітбюро піша: «камуністы растлумачваюць рабочым, што кожная стачка дапамагае паслабіць імпэрыялістычны рабочы ўрад і таму аказвае не пасрэдную дапамогу нямецкім рабочым, якія вядуць барацьбу ня толькі з нямецкімі капіталістамі, але і з іншымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Нямецкія таварышы, мы разам з вамі выйдзем на вуліцы і будзем дэманстраваць гатоўнасьць падтрыманьня нямецкай рэвалюцыі. Няхай жыве савецкая Нямеччына! Няхай жыве адзінства нямецкіх і ангельскіх рабочых!

Паніка у камэрцыйных фінансавых колах Латвіі

РЫГА. 15-VII. Ня гледзячы на ўчарайшыя заспакойлівыя заявы старшыні латвійскага банку Пліэ наконт краху Данатбанку, паніка ў камэрцыйных фінансавых колах Латвіі ня спынілася, а ўзмоцнілася.

Урад у тэрміновым парадку ўнёс у сойм законапраэкт аб гарантаваньні ўрадам укладаў на бягучыя рахункі ў прыватных банках. Лам сёньня 50,3 амэрыканскіх долярыў супроць 51,8 учора.

Зьніжэньне курсу акцый на ўсіх біржах Японіі

ТОКІЕ. 15-VII. Паведамленьні аб фінансавай катастрофе ў Нямеччыне выклікалі на ўсіх біржах Японіі моцнае зьніжэньне курсаў акцый, да 5—6 ien. Зьнізіліся таксама цэны на важнейшыя экспортныя тавары.

Бурны мітынг чыгуначнікаў і паштовых служачых у Катавіцах

ВАРШАВА. Як паведамляе «Газэта Варшаўска», 11-га ліпеня ў Катавіцах адбыўся вялікі мітынг чыгуначнікаў і паштовых служачых супроць зьніжэньня зарплаты. На мітынгу разгарнуліся бурныя спрэчкі. Выступаючыя прамоўцы—рабочыя, выконваючы здраднічую прадажнічую ролю сацыял-фашысцкіх прафсаюзаў, за клікалі да забастоўкі, калі дамаганьні рабочых аб скасаваньні зьніжэньня зарплаты, ня будуць ажыцьцяўлены.

Сацыял-фашысцкія «спэцы» на мітынгу пацярпелі поўнае паражэньне. Ніводнаму з іх рабочыя не далі закончыць свае выступленьні, бурнымі выгукамі—«далоў здраднікаў».

У прынятай рэзалюцыі чыгуначнікі і служачыя пошты дамагаюцца неадкладнага скасаваньня зьніжэньня зарплаты пагражаючы ў працяўным выпадку забастоўкай. У горадзе пануе выключна напружанае становішча.

Наступленьне капіталу на зарплату рабочых

ВАРШАВА. «Газэта Варшаўска» паведамляе, што з прычыны скарачэньня зарплаты рабочым на 10 проц., рабочыя варшаўскіх цагельняў рыхтуюцца да забастоўкі. Штодня на цагельнях адбываюцца мітынгі-лятучкі рабочых у знак пратэсту супроць новага зьніжэньня зарплаты.

Фашысцкія і сацыял-фашысцкія прафсаюзы вядуць з дапамогаю паліцыі кампанію па ўгаворы рабочых—не баставаць. Сярод рабочых цагельняў палісьці ўчыняе шматлікія арышты.

На буйнейшай фабрыцы ў Варшаве —«Паравоз» таксама абвешчана зьніжэньне зарплаты рабочых. Рабочыя на мітынгу пратэсту супроць зьніжэньня зарплаты аднагалосна прынялі рэзалюцыю, у якой заяўляюць—«калі зьніжэньне зарплаты адміністрацыяй не будзе здзейснена—абвяшчаем забастоўку».

Новыя 3.000 рабочых выкідаюцца на брук

ВАРШАВА. «Работнік» паведамляе, што гэтымі днямі ў Жырардове спыняюць сваю работу тры фабрыкі, на якіх знаходзіцца 3.000 рабочых.

У горадзе пануе вельмі напружанае становішча. Штодня адбываюцца вялікія дэманстрацыі рабочых.

Катаржны прысуд за камуністычную дзейнасьць

ВАРШАВА. Як паведамляе «Газэта Варшаўска» 11-га ліпеня ў Лодзі адбыўся працэс чатырох па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да камуністычнага саюзу моладзі Польшчы.

Гетлер засуджаны на 2 гады катаргі, Абрам Герсон—на 3 гады і Прэсайзэнаў—на 1 год. Адзін апраўданы.

На Нью-Ёркскай біржы нямецкія паперы працягваюць зьніжацца

НЬЮ-ЁРК, 14-7. «Асашыейтэд Прэс» паведамляе, што ў банкаўскіх колах не чакаюць, каб у бліжэйшыя часы Нямеччыне былі прадстаўлены новыя крэдыты.

На нью-ёрскай біржы нямецкія паперы працягваюць зьніжацца. Наглядаецца зьніжэньне і ўсіх іншых біржавых каштоўнасьцяў. На таварнай біржы цэны на пшаніцу дасягнулі найбольш нізкага ўзроўню за ўвесь час, пачынаючы з 1894 году.

Міжнародная хроніка

⊙ Гавас паведамляе з Мадрыду, што невядомымі перарэзаны тэлефонны кабель, які злучае Мадрыд з заграніцай.

⊙ Паводле паведамленьня па тэлеграфе з Бамбэю, у двух туземных дзяржавах Індыі — Раджкот і Індор—выбухнулі стачкі тэкстыльных рабочых, патрабаваўных скарочаньня рабочага дню з 14 да 10 гадзін.

⊙ У Дрэзьдзене на 4 тыдні забаронена мясцовая камуністычная газэта «Арбэйтэр Штыме».

Паводле даных МОПР'у за час забастоўкі вуглякопаў у штатах Пэнсільванія і Агайо ўчынена 876 арыштаў. 400 арыштаваных ужо прысуджаны да зьняволеньня на розныя тэрміны.

Адкрываем усебеларускую канфэрэнцыю

—па пытаньню аб адзіным культпляне

Зьмяшчаемая сёньня ў нашай газэце пастанова агульнага сходу рабочых і інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў заводу імя Варашылава зьяўляецца важнейшым палітычным дакументам. Варашылаўцы першымі ў БССР паказваюць прыклад канкрэтнай работы на фронце культурнага будаўніцтва. Рабочыя заводу імя Варашылава бяруць на сябе цэлы рад канкрэтных абавязкаў ў справе падцягваньня культпалітасьветнай работы да тэмпаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Варашылаўцы ставяць перад пралетарыятам і працоўнымі Менску адказнейшую і ганаровую задачу—ператварыць сталіцу Савецкай Беларусі ў горад суцэльнай пісьменнасьці. Заклік варашылаўцаў павінен быць даведзены да кожнага прадпрыемства, да кожнага рабочага ня толькі Менску, але і ўсёй БССР. Гарады Савецкай Беларусі павінны разгарнуць шырока сацспаборніцтва на хутчэйшае ператварэньне іх у гарады суцэльнай пісьменнасьці. У гэтую барацьбу павінны быць уцягнуты шырачэзныя масы рабочых, гэты рух павінен перакінуцца ў саўгасы, МТС, калгасы і вёскі.

Рэдакцыя «Савецкай Беларусі» прымае прапанову варашылаўцаў і на сваіх старонках адкрывае ўсебеларускую канфэрэнцыю-пераклічку па пытаньнях барацьбы за выкананьне культпляну, за адзіны культплян, за разгорнутую падрыхтоўку да новага навучальнага году.

Правядзеньне гэтай канфэрэнцыі зьяўляецца непадзельнай часткай другога этапу культэстафэты, зьяўляецца працягам работы рэйду ўдарных брыгад «С. Б.», «ЗКП» і ЦП працасьветы. Канфэрэнцыя-пераклічка ставіць сваёй задачай узьняць працоўныя масы Беларусі на барацьбу за ажыцьцяўленьне дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б у галіне культурнай рэвалюцыі. Яна дасьць магчымасьць выявіць лепшы вопыт і перанесьці яго на ўсю БССР.

Нам трэба 60 проц. дзіцячага і дарослага працоўнага насельніцтва пасадзіць за вучобу, нам трэба па бальшавіцку падрыхтаваць да новага навучальнага году, нам трэба змагацца за ператварэньне Савецкай Беларусі—ў краіну суцэльнай пісьменнасьці. Перад намі стаіць задача—ўсю культмасавую работу паставіць на службу задачам сацыялістычнага будаўніцтва, на службу прамфінпляну і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Пад кіраўніцтвам партыі рабочая кляса БССР гэтыя задачы выканае з посьпехам.

Прамова правадыра праводзіцца ў жыцьцё

Віцебск. (БЕЛТА). Трыкутнік пашчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін, абгаварыўшы прамову т. Сталіна, вызначыў рад мерапрыемстваў. Пастанова лена да 20-га ліпеня правесьці дакладны вучот рабсілы. У месячны тэрмін склаўці цьвёрды план патрэбнасьці рабочай сілы на 1932 г. Пачаць вярбоўку рабочай сілы з вёскі на дагаворных пачатках. Паставіць перад Гарсаветам пытаньне аб прымацаваньні спэцыяльнага сельсавету для арганізаванага набору рабочай сілы. Правесьці дэкадзік праверкі руху рацыяналізатарскіх прапаноў. Увесьці зьдзельны прэміяльна-прагрэсыўную аплату працы. Праверыць работу ЗРК. Пашырыць дзіцячыя ясьлі на 60 месц. Прымацаваць майстраў да машын і вучняў. Арганізаваць кароткатэрміновыя курсы для плянавай падрыхтоўкі рабочых выдзеленцаў у кожным цэху. Стварыць тэхнічныя гурткі. Прыступіць да поўнага пераводу ўсіх цэхаў на гаспадарчы разрахунак. У дэкадны тэрмін увесьці чэкавую сыстэму разьлікаў паміж цэхамі.

Другі ўсебеларускі зьезд рабсельваенкораў

Сацспаборніцтвам друку і рабселькораў БССР і УССР

паскорым бальшавіцкае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб перабудове рабселькораўскага руху

Пастанова другога ўсебеларускага зьезду рабселькораў па пытаньні сацспаборніцтва паміж друкам і рабселькорамі БССР і УССР

Партыйна-савецкі друк і рабселькораўскі рух, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, дасягнулі за апошні пэрыяд вялізарных посьпехаў. Аб гэтым яскрава гаворыць бурны рост тыражоў газэт, арганізацыя новых тысяч раённых, фабрычна-заводзкіх і калгасных газэт, значнае ўзьняцьце ролі і месца друку, і рабселькораў у разгорнутым сацыялістычным наступленьні, у барацьбе за генэральную лінію партыі на два франты, у барацьбе за ажыцьцяўленьне гаспадарча-палітычных задач, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Далейшае паляпшэньне якасьці газэт, укараненьне ў штодзённую практыку ўсё новых форм і мэтадаў апэрацыйна-масавай работы, перабудова рабселькораўскага руху і кіраўніцтва ім на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) стаіць першачарговай задачай.

Сацыялістычнае спаборніцтва, як «камуністычны мэтад будаўніцтва сацыялізму, на аснове максымальнай актыўнасьці мас» (Сталін) павінна служыць асноўным мэтадам у справе далейшага ўзмацненьня і паляпшэньня работы газэт, у справе яшчэ большага ўздыму рабселькораўскага руху.

Вось чаму 2-гі ўсебеларускі зьезд рабселькораў з вялікім задавальненьнем прымае выклік на сацспаборніцтва друку і рабселькораў УССР з друкам і рабселькорамі БССР па лепшым ажыцьцяўленьні пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і кіраўніцтва ім.

Асноўнымі паказальнікамі пры заключэньні сацдагавораў павінна быць: барацьба газэт і рабселькораў за выкананьне гаспадарча-палітычных задач і перабудову рабселькораўскага руху на аснове поўнай рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 г., пастановы ўсесаюзнай нарады пры «Правде» па пытаньнях рабселькораўскага руху і 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Кожная цэнтральная і раённая газэта БССР, выходзячы з гэтай устаноўкі павінна ўзяць на сябе канкрэтныя абавязкі і заключыць сацдагавор на індывідуальнае спаборніцтва з адпаведнай цэнтральнай і раённай газэтай УССР.

Канкрэтныя абавязкі шматтыражак і насьценгазэт ўключыцца ў сацдагавор адпаведных раённых газэт.

Праекты дагавораў на сацспаборніцтва раённых газэт з уключэньнем абавязкаў, узятых шматтыражкамі і рабселькорамі, павінны быць распрацаваны не пазьней 15 жніўня і да 1 верасьня г. г. заключаны з адпаведнымі газэтамі УССР.

Складнай часткай сацспаборніцтва паміж друкам і рабселькорамі БССР, друкам і рабселькорамі УССР, зьяўляецца сацыялістычны абмен лепшым вопытам апэрацыйна-масавай работы газэт і рабселькораў, якія спаборнічаюць, у выглядзе ўзаемнага зьмяшчэньня абменных старонак.

На зачыненьні зьезду рабсельваенкораў.

вопыту, арганізацыі жывога абмену праз узаемную пасылку прадстаўнікоў газэт і рабселькораў і г. д.

Падрыхтоўчая работа па заключэньні сацдагавораў павінна праводзіцца як масава-палітычная кампанія, цесна зьвязаная з прапрацоўкай пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў. Гонарам кожнай раённай газэты, кожнай шматтыражкі і насьценгазэт павінна быць уключэньне ў індывідуальнае сацспаборніцтва.

Распрацоўку і падпісаньне агульнага сацдагавору ад імя друку і рабселькораў БССР ,зьезд даручае ЦО КП(б)Б—«Зьвязьдзе» і газэце «Рабселькор».

Арбітрам на выкананьне сацдагавору паміж рэспублікамі, зьезд абірае ЦО—«Правду» і ўсесаюзны кіруючы часопіс «Рабкресткор».

Рабселькоры! У першыя рады

дабраахвотнага руху за аўладаньне беларускай мовай, за вывучэньне гісторыі і эканомікі БССР

Другі зьезд рабсельваенкораў БССР вітае пачын рабочых барашылаўцаў, сваячасова падтрыманы газэтай «Рабочий», аб добраахвотным аўладаньні беларускай мовай і заклікае ўсіх рабселькораў і ўдарнікаў быць застрэльшчыкамі шырокага добраахвотнага руху за аўладаньне беларускай мовай, за вывучэньне гісторыі і эканомікі Беларусі.

Зьезд рабселькораў БССР заклікае ўсе зьвеньні прафсаюзаў забясьпечыць гурткі па добраахвотным вывучэньні беларускай мовы, кіраўніцтвам і практычнай дапамогай.

Зьезд падкрэсьлівае неабходнасьць усю работу праводзіць мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, асьвятляць першы вопыт на старонках цэнтральнага і нізавога друку.

Другі зьезд рабселькораў БССР заклікае беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў вылучыць кіраўнікоў для гурткоў на вывучэньні беларускай мовы.

Пашырэньне добраахвотнага руху рабочых па беларусізацыі зьяўляецца практычным ажыцьцяўленьнем пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б і лепшым правядзеньнем у жыцьцё ленінскай нацпалітыкі нашай камуністычнай партыі.

Ніводнага рабкора, ніводнага ўдарніка па-за добраахвотным рухам у галіне беларусізацыі.

Няхай жыве камуністычная партыя і яе ЦК—правадыры ленінскай нацпалітыкі, якая зьяўляецца фундамантам нашага Савецкага Саюзу.

Апартуністы зрываюць торфараспрацоўкі

Некалькі год таму назад у м. Дукоры, Пухавіцкага раёну, было арганізавана тарфяное таварыства, якое шырока разгарнула работу. Пачалі капаць торф для апалу і на продаж дзяржаве. У гэтай рабоце была вялікая зацікаўленасьць з боку сялян. Але сельсавет замест таго, каб дапамагчы тарфяному таварыству перашкодзіў у яго рабоце.

Паводле пастановы Дукорскага сельсавету была забаронена распрацоўка торфу і тарфяное т-ва распалася, з таго часу прайшло ўжо некалькі год. У сёлетнім годзе зьявілася думка прадзяжасьці наб зноў арганізаваць таварыства, але сельсавет да гэтай справы аднёсься надзвычайна холадна, не палічыў сваім абавязкам дапамагчы наладзіць работу. І вось цяпер аб гэтым сельсавет зусім маўчыць.

Растлумачальнай работы сярод насельніцтва аб выгоднасьці арганізацыі тарфянога таварыства не праводзіцца ні сельсаветам, ні партыйна-камсамольскай ячэйкай. А між тым база для арганізацыі ў сельсавеце мацца надзвычайна вялікая. Па сельсавеце ля кожнага калгасу і вёскі маюцца вялікія залежы торфу, які нікім не скарыстоўваецца і пры жаданьні можна было-б пры кожным калгасе і вёсцы арганізаваць тарфянае таварыства. Гэтыя факты гавораць за тое, што партыйная ячэйка м. Дукоры, а таксама і сельсавет недаацэньваюць справу торфу, чым праяўляюць правы апартунізм на практыцы. Трэба даць рашучы адпор апартуністам—агентуры кулака, якія зрываюць работу на торфараспрацоўках.

Л.

Дзённая зводка

па выпрацоўцы торфу на найбольш буйных торфазаводах БССР на 13 ліпеня 1931 г.

Назва торфазаводаў	Процант выканаьня пляну
„Бальшавік"	67,1
Грэбнёва	34,6
Давыдаўка	65 1
„Чырвоны Тарфянік"	102,2
„Ленінскі Шлях"	117,6
„Новая Беларусь"	71,7
„1-га Мая"	70,7
„Асінторф"	39,7
„Шлях Сацыялізму"	60,9

За азьвіцьцё грамадзянскай авіяцыі ў БССР

Штогод усё гусьцей і гусьцей сетка паветраных ліній апутвае зямную кулю. Да пачатку 1930 году Нямеччына мела сетку паветраных зносін на адлегласьці 29.800 клм., Францыя—31.533 клм., ПАЗШ—59.500 клм. У СССР паветраная сетка ў 1930 годзе складала 26.800 клм.

У той час, як імпэрыялістычныя дзяржавы бачаць у грамадзянскай авіяцыі, галоўным чынам, магутны рэзэрв для вайсковага флёту, у нас, у СССР разьвіцьцё грамадзянскай авіяцыі выклікаецца пасьпяховым сацыялістычным будаўніцтвам і ўсё ўзрастаючымі патрэбамі працоўных мас.

Ужо ў сучасны момант грамадзянская авіяцыя адыгрывае ў жыцьці СССР вялізарную эканамічную і культурную ролю. Дзякуючы авіяцыі адсталыя, глухія куты Туркестану далучаны да культурнага жыцьця і сацыялістычнага будаўніцтва. Праз вяскі, непрыступныя горы нясе самалёт пасажыраў, пошту, грузы. Усё часьцей і часьцей прапэлеры сталёвых птушак парушаюць адвечны спакой непраходных лясоў і тайгі Сібіру. Нашы рыбныя, морскія промыслы, таварыства па барацьбе са шкоднікамі палёў і лясоў шырока карыстаюцца паслугамі самалётаў.

Пасажырскія паветраныя лініі перасякаюць СССР у розных напрамках. У апошнія часы да самалёту прыстасавана дастаўка матрыц ЦО партыі «Правда» у буйныя пралетарскія цэнтры (Ленінград, Харкаў, Растоў н.-д. і інш.) і працоўныя гэтых гарадоў атрымліваюць магчымасьць наравне з масквічамі ў дзень выхаду газэты ўключацца ў агульную барацьбу за выкананьне задач, якія ставяцца авангардам рабочае клясы.

Аднак, перад грамадзянскай авіяцыяй пастаўлены больш цяжкія і больш ганаровыя задачы—да канца пяцігодкі (1933 год) дасягнуць 130.000 клм. паветранага шляху і гэтым самым дагнаць і перагнаць перадавыя ў тэхніка-эканамічных адносінах капіталістычныя дзяржавы, у тым ліку і Амэрыку. Гэткая воля рабочае клясы і працоўных Савецкага Саюзу. Гэтыя вялізарнейшыя задачы могуць быць ажыцьцёўлены толькі пры агульным і дружным намаганьні працоўных мас.

Што зроблена ў адносінах разьвіцьця грамадзянскай авіяцыі ў БССР?

ВОГВФ (Усесаюзнае аб'яднаньне грамадзянскага паветранага флёту) пастанавіла адкрыць у бягучым годзе паветраную лінію Менск—Масква. Апроч таго, ўтварацца выпускаьні па лініі Харкаў—Менск праз Гомель і Ленінград—Кіеў праз Віцебск—Гомель.

Працоўныя БССР кроўна зацікаўлены ў разьвіцьці ў сябе грамадзянскай авіяцыі.

Пры дапамозе самалёту можна будзе дастаўляць матрыцы «Правды» для надрукаваньня яе ў Менску і працоўныя Менску змогуць своячасова рагаваць на ўсе палітычныя і гаспадарчыя задачы нашага Саюзу. Сталіца БССР будзе зьвязана з Масквой найкарацейшым шляхам. Самалёт палегчыць зносіны рэспубліканскіх арганізацый з Усесаюзным цэнтрам і праз 4 гадзіны шляху самалёт здолее дастаўляць пасажыраў, пошту і груз з Менску ў Маскву або назад.

Без шырокага ўдзелу працоўных мас БССР справа разьвіцьця грамадзянскай авіяцыі ў Беларусі будзе рушыцца чарапашымі крокамі.

Што канкрэтна можна зрабіць?

Буйнейшыя заводы, саўгасы, калгасы бяруць шэфства над аэрадромамі, пасадачнымі пляцоўкамі.

Гарадзкія і раённыя выканкомы павінны прывесьці маючыяся аэрадромы ў належны стан, правесьці пад'язныя шляхі да іх, устанавіць добрыя шляхі зносін з аэрадромам, забясьпечыць падачу вады, асьвятленьня і г. д. У некаторых пунктах, як напрыклад, у Гомлі можна прыступіць да пабудовы аэравакзалу.

Неабходна, каб усе раёны, якія ляжаць на шляху паказаных паветраных трас, па сваёй ініцыятыве прыступілі да падшуканьня і абсталяваньня пасадачных пляцовак і падтрыманьня іх ў належным відзе.

Затым, трэба больш увагі аддаць будаўніцтву Віцебскай школы грамадзянскіх лётнікаў Асоавіяхіму імя тав. Варашылава. Менскаму, Гомельскаму, Бабруйскаму, Магілёўскаму саветам Асоавіяхіму, якім дазволены месячны збор сродкаў на гэтую школу, неадкладна ўзмоцніць збор сродкаў. Арганізацыі Асоавіяхіму павінны зрабіцца застрэльшчыкамі ў справе аказаньня садзейнічаньня разьвіцьцю грамадзянскай авіяцыі. Камсамол, а праз яго і ўсе юныя авіябудаўнікі ня могуць знаходзіцца ў баку ад дапамогі грамадзянскай авіяцыі.

З свайго боку ВОГВФ павінен пасьпяшаць з адкрыцьцем паветранай лініі Менск—Масква.

Грамадзянская авіяцыя ў БССР павінна атрымаць усе правы грамадзянства і пры падтрыманьні шырокіх працоўных мас пакрыць сваімі лініямі ўсю тэрыторыю СССР.

Будзіловіч.

Віцебск уключыўся ў дэкаднік дапамогі грамадзянскай авіяцыі

ВІЦЕБСК, 16-VII. (БЕЛТА) па пастанове гаркому КП(б)Б з 15-га па 25-га ліпеня праводзіцца дэкаднік дапамогі грамадзянскай авіяцыі. Створана камісія з прадстаўнікоў гаркому КП(б)Б, гарсавету і прафсавету, камсамолу, Асоавіяхіму, якой даручана ў трохдзённы тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні дэкадніка.

Ахапіць усіх падпіскаю

Заданьне па рэалізацыі пазыкі па гор. Віцебску выканана больш чым на 105 проц. Але выкананьне кантрольнага заданьні па рэалізацыі пазыкі па горадзе яшчэ ня кажа аб тым, што ўсе працоўныя ахоплены падпіскай. Ёсьць яшчэ шмат рабочых і працоўных, якія падпіскай не ахоплены. Зусім дрэнна абстаіць справа з рэалізацыяй пазыкі ў прыгарадных сельсаветах, дзе процант выкананьня заданьня па вёсцы зусім нязначны—5—10 проц.

Трэба ахапіць усіх працоўных падпіскаю.

Спэцкор.

Дзяржплянам сумесна з рэдакцыямі газэт „Савецкая Беларусь" і „Калгасьнік Беларусі" на 19 ліпеня а 7 гадзіне

СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА-КАНФЭРЭНЦЫЯ

ПА ПЫТАНЬНІ: ШЛЯХІ РАЗЬВІЦЬЦЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР У 1932 ГОДЗЕ

Дакладчык—член прэзыдыуму Дзяржпляну—тав. БОНДАР.

Запрашаюцца працаўнікі НДІ сацэканструкцыі, БАН, таварыства аграрнікаў-марксыстаў, Наркамзему, Калгасцэнтру, трэстаў, сел.-гасп. каапэрацыі, друкарні імя Сталіна, заводаў „Энэргія", „Камунар", саюзу с-г рабочых; рабселькораў пэнтр. газэт: „Зьвязда", „Рабочы", „Чырвоная Зьмена", „Сельскі рабочы Беларусі", „Акцябр", „Орка".

НАРАДА АДБУДЗЕЦЦА

ў ленінскім кутку Дзяржпляну—Пляц Волі, 5.

Праз уборачную эстафэту саветаў

Мабілізуем шырокія масы рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў на барацьбу за другі бальшавіцкі ўраджай, за ажыўленьне работы сэкцый пры сельсаветах

Зембінскія местачковы і сельскі саветы першымі ў БССР уключыліся ва ўсесаюзную ўборачную эстафэту саветаў

Гарсаветы і сельсаветы БССР, прымайце выклік зембінцаў!

Уборачная кампанія зьяўляецца най адказьнейшым вучасткам барацьбы за выкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі, году завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

Да пачатку ўборачнай кампаніі асноўных культур засталіся лічаныя дні. Станоўчыя вынікі атрыманыя ад правядзеньня другой калгаснай вясны даюць магчымасьць яшчэ з большым посьпехам правесьці ўборку ўраджаю і па-баявому падрыхтавацца да асеньняй пасеўнай кампаніі. Бальшавіцкія тэмпы, якія паказаў сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі павінны быць цалкам захаваны ў час уборкі ўраджаю і правядзеньня асеньняй сяўбы. Ад таго, як будзе праведзена ўборачная кампанія і асеньняя сяўба будзе залежыць далейшае разгортваньне суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як кляасы.

Улічваючы вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне ўборачнай кампаніі. Сьяблідкі сельсавет (Паўночна-Каўказкі край) зьвярнуўся з заклікам да ўсіх саветаў СССР аб правядзеньні Ўсесаюзнай уборачнай эстафэты Саветаў.

Аб'яднанае пасяджаньне бюро ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ, прэзыдыумаў Зембінскага местачковага савету і сельскага савету пры ўдзеле прадстаўнікоў калгасаў «Чырвоная Зьмена» «Пяцігодка» і саўгас «Сэржпутова», абгаварыўшы зварот Сьяблідкага сельсавету, пастанаўляе—уключыцца ва ўсесаюзную ўборачную эстафэту саветаў.

Уключаючыся ва ўсесаюзную ўборачную эстафэту Саветаў, мы абавязуемся забясьпечыць выкананьне наступных задач:

1. На працягу тыдню давесьці плян уборкі ўраджаю да кожнага саўгаснага рабочага, калгасьніка, бедняка і сераднякa-аднаасобніка;

2. Да пачатку ўборкі ўраджаю скончыць рамонт усіх уборачных машын.

3. Уборку ўраджаю: а) азімых культур 1930 году на плошчы 731 га правесьці на працягу 10 дзён; б) яравых культур, на плошчы 3.218 га правесьці на працягу 25 дзён; в) уборку бульбы і кораньплодаў на плошчы ў 7.370 га—на працягу 3-х тыдняў; г) тэхнічных культур (лён і канопель) на плошчы 103 га правесьці на працягу 5 дзён;

4. У справе пасьпяховага правядзеньня ўборачнай кампаніі зьвілазнейшае значэньне мае вырашэньне пытаньня абагуленьня яравых і азімых пасеваў маладых калгасьнікаў. Таму мы абавязуемся правесьці адпаведную работу па абагуленьні гэтых пасеваў да пачатку ўборкі ўраджаю;

5. Вучот і арганізацыя працы вырашае ўсё. Мы будзем дамагацца, каб да пачатку ўборкі ўраджаю не засталося ніводнага калгасьніка без членскай і разьліковай кніжкі. Мы абавязуемся прыняць усе меры да таго, каб была правільна расстаўлена рабочая сіла. Брыгада—асноўна арганізацыя працы. Уся рабочая сіла будзе разьбіта на атрадах і брыгадах, па рашаючых галінах работы;

6. Зьдзелыпчына — найадказьнейшы вучастак у арганізацыі працы. Мы забясьпечым поўнае і сапраўднае ўвядзеньне зьдзелыпчыны на ўсіх вучастках работы і зьнішчэньне абязьлічкі ў карыстаньні цягавай сілы і інвэнтаром;

7. Мы забясьпечым абагуленьне жывёлы ў нанова арганізаваных калгасах да 1-га жніўня 1931 году;

8. Дрэнная захаваньне ўраджаю дае вялікія страты гаспадарцы. Мы абавязуемся арганізаваць масы на справу захаваньня ўраджаю і забясьпечыць здачу прадукцыі па кантрактацыі і бальшавіцкае правядзеньне хлебазагатовак;

9. Сілаваньне кармоў—баявая задача. Мы бярэм на сябе абавязак перавыканаць плянавыя заданьні па сілаваньні;

10. У час уборкі ўраджаю арганізуем прамадзкае харчаваньне для рабочых і калгасьнікаў;

11. Будзем змагацца за давядзеньне процанту калектывізацыі да пачатку асеньняй сяўбы да 50 проц.;

12. Кожны савет, зьяўляючыся органам пралетарскай дыктатуры ў час уборачнай кампаніі павінен узмацніць сваю клясавую пільнасьць. Мы забясьпечым прымацаваньне камуністаў і камсамольцаў, членаў саветаў, актыў саветаў—калгасьнікаў да брыгад, якія будуць несьці непасрэдную адказнасьць за работу апошніх;

13. Арганізацыя сацыялістычных мэтадаў працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, павінна ахапіць усіх саўгасных рабочых і калгасьнікаў.

Партыйцы, камсамольцы, дэпутаты саветаў першыя арганізатары сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Уключаючыся ва ўсесаюзную ўборачную эстафэту саветаў, мы будзем па-бальшавіцку змагацца за другі калгасны ўраджай ,за новы калгасны прыклад, за генэральную лінію партыі.

Мы выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу і ўключыцца ва ўсесаюзную ўборачную эстафэту ўсе гарсаветы і сельсаветы БССР, у першую чаргу—Негарэльскі і Станькаўскі сельсаветы (Койданаўскі раён), Капыльскі местачковы савет (Капыльскі раён), Касьцюковіцкі і Лошніцкі сельсаветы (Барысаўскі раён), Рудзенскі сельсавет (Сьмілавіцкі раён).

Праверку выкананьня ўзятых на сябе абавязацельстваў даручаем газэце «Савецкая Беларусь».

Бюро Зембінскай яч. КП(б)Б—**Ульяновіч, Шыфрын, Фрыдман.**
Прэзыдыум Зембінскага мест. савету—**Куніцкі, Тамашэвіч, Вашкевіч.**
Старшыня Зембінскага сельсавету **Дудзіцкі.**
Бюро яч. ЛКСМБ—**Аксень, Эйдэльман, Шульман.**
Дырэктар саўгасу «Сержпутова»—**Яроцкі.**
Праўленьне калгасу «Чырвоная Зьмена»—**Крупенін.**
Праўленьне калгасу «Пяцігодка»—**Шыдлоўскі.**

Неадкладна абнавіць кіраўніцтва Лучнікаўскага сельсавету

Апартуністычная бязьдзейнасьць прывяла да развалу работы сэкцый

Лучнікаўскі сельсавет самы адсталы на Случчыне. Кожная гаспадарча-палітычная кампанія ў гэтым сельсавеце праходзіць ня зусім адвальняюча. Лучнікаўскі сельсавет горш за ўсіх ідзе па загатоўках і па калектывізацыі. Гэты сельсавет налічвае толькі 8 проц. калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у той час, калі Случкі раён набліжаецца да 40 проц.

Галоўнай прычынай гэтага ганебнага адставаньня зьяўляецца апартуністычная бязьдзейнасьць кіраўніцтва сельсавету, ў прыватнасьці яго старшыні Савановіч Пелагеі—члена заможнай сям'і, яна наатул варожа адносіцца да мерапрыемстваў партыі і ўраду, асабліва да калектывізацыі. Не праводзіць ніякай растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкага сялянства аб вялікім значэньні пераставаньня аднаасобнай гаспадаркі ў сацыялістычную, не папулярызуе пастаноў партыі і ўраду па гэтым пытаньні, не мабілізуе вакол яго і іншых гаспадарча-палітычных пытаньняў, грамадзкасьць і вясковага актыву.

Работа сярод жанчын зусім адсутнічае ня гледзячы на тое, што старшыня сельсавету—жанчына, якая павінна была-б у першую чаргу зацікавіцца гэтай справай.

Культурна-масавая работа таксама не вядзецца, што разьвязвае рукі кулацтву і яго агентуры, якія вядуць шалёную агітацыю супроць калектывізацыі і іншых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў.

Апроч усяго гэтага, кіраўніцтва сельсавету страціла сваю клясавую пільнасьць і стала на шлях утойваньня кулацкіх гаспадарак, не праводзячы індывідуальнага абкладаньня раду кулацкіх і заможных гаспадарак.

Так, у Лучнікаў жыве кулак Супрановіч Апанас, які раней быў падрадчыкам на пабудове шасэйных дарог, эксплёатаваў рабочую сілу, трымаў батракоў і г. д.

І цяпер ён мае кулацкую гаспадарку, але індывідуальным падаткам не абкладзены. Такіх кулацка-заможных гаспадарак у Лучнікаўскім сельсавеце шмат, але дзякуючы палітычнай сьлепаце прэзыдыуму сельсавету, ім удалося ўхіліцца ад індывідуальнага абкладаньня.

Што-ж да апошніх дырэктыў партыі і ўраду аб перабудове работы сельсаветаў у адпаведнасьці з задачамі трэцяга рашаючага году пяцігодкі, аб узьняцьці і разгортваньні работы сэкцый, аб павароце тварам да калгаснага будаўніцтва, дык на іх кіраўніцтва Лучнікаўскім сельсаветам не зварочае літаральна ніякай увагі. Сэкцыі сельсавету, як і раней, зусім бязьдзейнічаюць, не праводзячы ніякай работы, а кіраўніцтва сельсаветам палец аб палец не ўдарае каб гэтую работу наладзіць.

Случкі РВК аб усіх гэтых фактах ведае, але ніякіх мер да іх зьнішчэньня ня прымае. Райвыканком за бязьдзейнасьць вынёс толькі вымову старшыні сельсавету і на гэтым супакоўся.

Усе вышэйпаданыя факты сьведчаць аб тым, што Лучнікаўскі сельсавет мае прарывы ня толькі ў аднэй якой-небудзь галіне работы, але па ўсіх галінах. Усё гэта сьведчыць аб тым, што фактычна Лучнікаўскага сельсавету як савецкай улады на вёсцы—няма.

Мы патрабуем ад Случкага РВК неадкладна абнавіць кіруючы склад Лучнікаўскага сельсавету з тым, каб у бліжэйшы час стварыць рашучы пералом ва ўсёй рабоце сельсавету і асабліва яго сэкцый у адпаведнасьці з апублікаваным новым палажэньнем аб сэкцыях пры сельсаветах.

Ал. Курдо.

Камсоды Бабруйшчыны цягнуцца ў хвасьце

БАБРУЙСК. (БЕЛТА). Месячнік рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага» на вёсцы зрываецца. Па сельскіх саветах гэтым пытаньнем амаль зусім не займаюцца. Толькі ў Багушэўскім і Рымавецкім сельсаветах праведзена некаторая работа, а ў астатніх абмежаваліся прыёмам рэзалюцыі.

Сярод аднаасобнікаў ніякай работы не праводзіцца.

Ўборачныя машыны завода 15 „Чырвоны Мэталіст"

13, і 14, ліпеня

За 31-VII завод «Чырвоны Мэталіст» выпусьціў корнарэзак 30, жмыхадрабілак 4, грузападъёмных машын 4 і значную колькасьць плугоў (150 шт.). Буль бакапалак за 13 і 14 ліпеня выпушчана 11 штук. Лічба выпуску бульбакапалак яўна недастатковая, калі ўлічыць тое, што гэтыя машыны былі ў асноўным сабраны і да іх трэба было толькі падабраць камплект пастронак і афарбаваць. 14-га у выхадны дзень працавалі ліцейны, такарны і плужна-зборачны цэх. Рамонтны цэх быў перакінуты на масавую вытворчасьць сельска-гаспадарчых машын. Напружаньне зробленае заводам 14-га дало магчымасьць фарсіраваць выраб экспартных машын.

З 15-VII наглядаецца пералом у вырабе бульбакапалак. Вызваленая ад выкананьня праграмы рабочая сіла будзе перакінута на масавы выраб бульбакапалкі. 100 годных камплектаў пастронак мопуць быць скарыстаны для вытуску гатовай прадукцыі. Неабходна ў тэрміновым парадку аслабаніць цэхі ад паўгатовай прадукцыі, маючы на ўвазе тое што да канца месяца неабходна аслабаніць месца, для пачатку масыўнай вытворчасьці.

Ужо зараз неабходна сыгналізаваць аб падрыхтоўцы да зборкі. Ня гледзячы на наяўнасьць сыраўны пры ўважлівым агляднае аказалася што нехапае некаторых вельмі важных сартоў жалеза. Для бульбакапалак нехапае круглага жалеза 18 мм, якое ідзе на сьпіцы. Жмыхадрабілкам нехапае 4 мм. ліставога жалеза неабходнага для разлучальнікаў. Дырэктар т. Сухаручкін адгрузіў гэта жалеза як лішак. Адгрузка 13 тон дэфіцытнага для заводу жалеза трэба расцэньваць як няўмень не апэраваць унутранымі рэсурсамі і безгаспадарчасьць.

Ліцейны цэх працягвае даваць вялікі процант браку. У цэху вельмі цесна. Фармоўшчыкі — мала кваліфікаваныя рабочыя. Да гэтага часу нельга адгрузіць корнарэзак, бо ліцейны цэх не забясьпечыў завод разлучальнымі каробкамі.

Наглядаючы за агульна-заводзкім працэсам, неабходна адзначыць вельмі значны прабел на заводзе. Гэта адсутнасьць міжцэхавых кладовак, што дэзарганізуе ўвесь працэс вытворчасьці. Бываюць выпадкі калі дэталі павінны былі быць забракаваны ў ліцейным цэху, а яны з абрубкі адразу ідуць на такарны варштат. Гэта прыводзіць да сумных вынікаў. Парушаецца вучот, кантроль, а самае галоўнае гаспадарчы разьлік.

У рабоце цэху адчуваецца слабае кіраўніцтва, нормы адсутнічаюць. Самі загадчыкі цэхамі ўстанаўляюць нормы часамі няверныя. Гэта нэрвуе рабочых

У апошнія дні пачасьціліся факты парушэньня працоўнай дысцыпліны. Рабочыя трактарнага цэху **Кудрашоў, Шэўход** і **Вальфсон** парушаюць унутраны парадак, самавольна разабралі фрэзэрны варштат. Група рабочых рамонтнага цэху адмовілася выканаць загад загадчыка вытворчасьці аб пераходзе на масавую работу па вырабу с.-г. машын. Ёсьць сярод іх і члены КП(б)Б. Заводакіраўніцтва звольніла некаторых з заводу.

Гарын.

Сваячасова забясьпечыць

уборку ўраджаю ўборачнымі машынамі

Усім Райза, райкалгассаюзам, МТС, райкаапсаюзам

Выкананьне пляну завозу ўборачных машын і запчастак да сэзону трывожнае ў сувязі са значнай недавыпрацоўкай прамысловасьцю.

Прапануем: па-першае, у максымальна кароткі тэрмін скончыць рамонт, мабілізаваўшы ўсе унутраныя рэсурсы, па-другое, поўнасьцю рэалізаваць машыны са складаў, па-трэцяе, арганізаваць поўнае выкарыстаньне наяўных трактароў, коняй, машын, правільнай расстаноўкі рабочай цягавай сілы арганізуючы ўзаемадапамогу ў межах раёну, саўгасаў, калгасаў, аднаасобнага сэктару з наліччам людзей, машын, коняй, па-чацьвертае, мабілізаваць усю грамадзкасьць, арганізацыі, установы раённых друк, на своячасовасьць ўборкі.

Наркамзем БССР РАЧЫЦКІ.
Нам. Старшыні Белкалгасцэнтру СТРЭЛЕ.

Для таго, каб атрымаць часткі да машын, трэба прайсьці некалькі інстанцый

Сельгасснаб не пераключыўся на аб слугоўваньне ўборачнай кампаніі. Апарат Сельгасснабу хварэе на бяздушны фармалізм. Лягчэй вярблюду перайсьці праз голкавае вушка, чым што-небудзь атрымаць з Сельгасснабу.

Горацкая МТС перавяла тысячу руб. у дзяржбанк для закупкі запасных частак да ўборачных машын.

23-га чэрвеня прыехаў ад МТС па часткі да машын тав. Стэска і зьвярнуўся непасрэдна да старшыні Белсель снабу тав. Талапілы.

Той нічога не паабяцаў і не адмовіў, а накіраваў яго да загадчыка разьмеркаваньнем запасных частак тав. Шорэ.

Тав. Шорэ ў водпуску запасных частак катэгорычна адмовіў, але накіраваў да загадчыка базай тав. Буракова з тым, каб той адпусьціў запасныя часткі па яго ўласным поглядзе і на «свой страх і рызыку».

Тав. Буракоў, зразумелая рэч, частак не адпусьціў, і накіраваў яго ў Трактарацэнтр, загадзя ведаючы, што ў Трактарацэнтры запасных частак няма і забясьпечаньнем займаецца выключна Сельгасснаб.

На другі дзень, прадстаўніком МТС накіраваўся ў Сельгасснаб старэйшы тэхнічны інспэктар Трактарацэнтру. Правандравалі яны таксама як і напярэдадні і вынікі атрымаліся тыя-ж.

Бачучы немагчымасьць атрыманьня запасных частак, прадстаўнік МТС на трэці дзень сваіх пакутваньняў перавёў грошы назад і парашыў ехаць на з чым. Зайшоўшы перад ад'ездам у Трактарацэнтр для адзнакі ў сваім камандыровачным пасьведчаньні, ён расказаў аб усім гэтым аднаму з работнікаў апарату, якія параілі яму зьвярнуцца ў Калгасцэнтр да тав. Міцькова.

Тав. Стэска так і зрабіў. Тав. Міцькоў тут-жа ўзяў тэлефонную трубку сказаў некалькі слоў тав. Талапілу і заявіў тав. Стэска, што запчасткі будуць яму зараз-жа адпушчаны.

Пасьля гэтага прадстаўнік МТС атрымаў ад тав. Талапілы загад аб атрыманьні запчастак.

Грошы на набыцьцё частак былі аднак адасланы назад. Таму часткі на рукі ня былі выданы наложным плацяжом, што выкліча затрымку ў атрыманьні запчастак ня менш як на 7—10 дзён.

Навошта патрабавалася тав. Талапілу аўторытэтнае слова тав. Міцькова? —Няўжо ён сам не арыентуецца гаспадарча - палітычных абставінах? Няўжо работа апарату так пабудавана, што патрэбна абыйсьці гэтулькі інстанцый, каб атрымаць самае неабходнае?

В.

„Новыя ўмовы прамысловасьці патрабуюць работы па-новаму" (Сталін)

Адкрыты ліст у адказ рабочым заводу імя Сталіна, рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу заводу „Чырвоны Мэталіст"

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал, сумесна з работнікамі цэхаў, прадстаўнікамі ячэйкі КП(б)Б і заўкому заводу «Чырвоны Мэталіст», 12 ліпеня гг., на супольным пасяджаньні, разабраўшы прамову т. Сталіна, адзначае:

Прамова т. Сталіна выключна правільна заўважвае становішча нашых фабрык і заводаў, усёй нашай прамысловасьці.

Як заўсёды правадыр нашай партыі—лепшы ленінец УсеКП(б) т. Сталін у сваёй прамове даў нам праграму дзеяньня ў новых умовах на новым этапе.

Мы павінны прызнаць, што досыць часта мы недастаткова гібка прыстасоўваемся да новых умоў, не заўважаем гэтых новых умоў і зьмяняючыхся абставін.

На нашым заводзе мы параўнаўча даўно пачалі ажыцьцяўленьне гаспадарчага разьліку ў цэхах, з боем заваявалі права да пераходу на перапынную пяцідзённку. Але да прамовы т. Сталіна ўсе гэтыя пытаньні ня былі паміж сабою зьвязаны ў адну цэльную праграму рэарганізацыі нашай работы.

Мы шчыра прызнаем, што працуем дрэнна. Мы не навучыліся плянаваць увесь вытворчы працэс, не ажыцьцяўляем як сьлед адзінаначальле. Пры бязумоўных дасягненьнях, якія мы маем, маем, аднак, цэлы рад буйных недахопаў, якія трэба прызнаць і па бальшавіцку выправіць. Да гэтых недахопаў адносіцца дрэнная работа па аўладаньні тэхнікай і слабая работа з нашымі вылучэнцамі, узвальваючы на іх цяжар адказнасьці за вядзеньне вытворчага працэсу, мы часамі нічога ня робім для падвышэньня тэхнічнага ўзроўню нашых цэхавых адміністратараў.

Мы ня выконваем прамфінпляну

Заклік т. Сталіна, усяляючы ў нас ба дзёрасьць і паказваючы асноўныя спосабы вырашэньня гаспадарчых і эканамічных пытаньняў дня, знойдзе ў нас шырокае падтрыманьне. Мы на сваёй нарадзе пастанавілі прыняць рад мер, якія лягуць у аснову нашай далейшай работы. Мы ведаем, што адны мі рэзалюцыямі, адными «заклінаньнямі» мы яшчэ ня выправім нашых памылак. Неабходна вялікая ўважлівая работа, да якой мы безадкладна прыступаем.

Рабочая сіла

Асноўная крыніца папаўненьня кваліфікаванымі рабочымі нашага заводу—гэта школа ФЗУ. Налічваючы ў сваіх радох каля 400 чал., школа рыхтуе нам кваліфікаваных, палітычна сьвядомых работнікаў, байцоў за прамфінплян. Аднак, мы нездаволены ўпаўне работаю школы, можна ўзяць курс на ўзмацненьне нагляду за школай і тэхнічнай дапамогі пэдагагічнаму працэсу. Лепшых вучняў-ударнікаў трэба датэрмінова выпусьціць на завод да варштата. Канстатуючы, што кваліфікаваныя рабочыя выкарыстоўваюцца часта на нашым заводзе не па прызначэньні—у працягу аднаго месяца пераглядзець увесь склад кваліфікаваных рабочых у сэнсе скарыстаньня іх па разрадах і кваліфікацыях.

Для ліквідацыі цяжучасьці рабочай сілы і падвядзеньня цьвёрдай базы пад наш завод, паставіць пытаньне перад Райкалгасам аб прымацаваньні да за воду калгасу, які-б мог даць збытак сваёй рабочай сілы. З выдзеленым калгасам заключыць неадкладна дагавор гаспадарчай ўзаемадапамогі, даручыўшы ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства дырэктару па працы ў працягу 2-х дэкад.

Нарада лічыць неабходным узяць пад асобы нагляд рабочых, якія знаходзяцца на перакваліфікацыі, аказваючы ім тэхнічную дапамогу і аддаючы ім дастаткова ўвагі. Для папаўненьня рабочых кадраў узяць курс на ўцягненьне жаночай працы з ліку жонак рабочых на масавую кваліфікацыю і лёгкія работы. Работніц, якія ўцягваюцца ў вытворчасьць, можна паставіць у такія ўмовы, каб яны маглі падвышаць сваю кваліфікацыю і прасоўвацца ўверх па ступенях разрадаў.

Нарада канстатуе, што Белмэталяаб'яднаньне да гэтага часу не ўпарадкавала пытаньня з курсамі па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы. Курсы падбіраюцца няўмела і выпушчаюць асоб «шырокіх спэцыяльнасьцяй», без канкрэтнага ўхілу і вузкай спэцыяльнасьці.

Заработная плата і быт рабочых

Трэба рашуча абвясьціць барацьбу з «ураўнілаўкай», якая на заводзе праяўлялася ў розных формах. АЭПу даручыць у працягу дэкады правесьць і далажыць аб выніках выкананьня прамфінпляну па частцы расстаноўкі рабочай сілы па спэцыяльнасьцях і разрадах. Адначасова правесьць фактычную зарплату па разрадах, вынішчаючы ўраўнілаўку. Асабліва ўпор зрабіць на пытаньні разыходжаньня ў зарплаце аднолькавых разрадаў. Органам ТНБ і цэхавай адміністрацыі пры выяўленьні гэтых момантаў апэрацыйна іх зьнішчаць. Пераглядзець зарплату, прафэсію вядучага характару і цяжкай працы, асабліва ў шкодных цэхах для падвышэньня зарплаты (выбаршчыкі, разьлівальшчыкі, калільшчыкі і інш.).

Апроч гэтага, устанавіць у цэхах такім чынам, каб выпрацоўка вызначалася ня толькі па разрадах, але і па выкананай рабоце, гэта будзе біць па ўраўняльных тэндэнцыях.

Пры ўжываньні жаночай працы ў масавым маштабе паставіць пытаньне перад Белмэтам і Гарсаветам аб адкрыцьці ясьляў пры нашым заводзе. Палепшаньне бытавых умоў рабочых заводу мажліва толькі, калі ЗРК палепшыць сваю работу, а сталоўка палепшыць якасьць абедаў.

Неабходна сёлета-ж вырашыць пытаньне аб пабудове корпусу для прыходзячых з калгасу рабочых і даручыць дырэктару па працы, сумесна з заўкомам канчаткова вырашыць пытаньне ў адпаведных інстанцыях аб пабудове новай сталоўкі.

Арганізацыя вытворчасьці і ліквідацыя абязьлічкі

Пад асабістую адказнасьць цэхавай адміністрацыі ў працягу аднэй 5-ідзённкі правесьці замацаваньне рабочых да варштатаў і да работы. Гэта значыць, што належыць вызначыць кола работ і дэталяй, якія вырабляе даны варштат. Адначасова з прымацаваньнем да варштатаў правесьці прымацаваньне да месц у цэху. «Абязьлічцы» трэба абвясьціць бязьлітасную вайну.

Штодзенна правяраць як выконваюцца тэхнічныя заданьні кожным рабочым і варштатам. Нарада з усёй рэзкасьцю завастрае ўвагу менавіта на гэтым моманце. Цэх, тэхнічнае кіраўніцтва, заводакіраўніцтва ў кожным асобным выпадку павінны выкрываць прычыны невыкананьня варштатам і рабочымі тэхнічных і вытворчых заданьняў. Зараз уся работа залежыць ад апэрацыйнасьці і гібкасьці. Кантроль выкананьня—кіруючае зьвяно ў нашай рабоце. Ад цэхавай адміністрацыі нарада патрабуе канчатковую ліквідацыю бясплянавасьці і бязладзьдзя ў расстаноўцы сіл. ТНБ закончыць паспартызацыю абсталяваньня, вызначэньне тэхнічных норм і інструкцыйных карт да варштатаў. Заводакіраўніцтву неабходна ўзмацніць кіраўніцтва і праверку выкананьня, ажыцьцяўляючы цьвёрда прынцып адзінаначальля і вытворчай дысцыпліны.

Пытаньне аб вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі

Канстатуючы, што на нашым заводзе інжынэрна-тэхнічны пэрсанал уключыўся ў заводзкае і прамадзкае жыцьцё, адзначыць, аднак, што ІТР, як арганізацыя працуе слаба. Аказва

Вёска—баявы вучастак пазыковай кампаніі

Па 14 раёнах БССР сярод сялянства не рэалізавана ніводнай аблігацыі

Праз сацспаборніцтва, ударніцтва і грамадзкі буксір дамагчыся на вёсцы посьпехаў гораду!

ЧОРНАЯ ДОШКА

раёнаў, якія не рэалізавалі на вёсцы ніводнай аблігацыі

Бабруйскі	Копыльскі
Барысаўскі	Лоеўскі
Веткаўскі	Мсьціслаўскі
Гарадоцкі	Полацкі
Жыткавіцкі	Плешчаніцкі
Заслаўскі	Смалявіцкі
Краснапольскі	Узьдзенскі

Аб пазыцы запамятавалі

У Петрыкоўскай рыбацкай арцелі за ўвесь час ня ставілася пытаньне аб падпісцы на пазыку «3-ці рашаючы» і ніводзін рыбак не падпісаўся. Ніякіх сходаў ніхто не праводзіў. Шчупак.

Калгасьнікі разгарнулі работу

Сярод калгасьнікаў калгасу імя 16 партызан, (Сьмілавіцкага раёну), шырока разгорнута работа па падпісцы на пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі». Гэта пытаньне абгаворана на агульным сходзе калгасу. Калгасьнікі на сходзе разгарнулі сацспаборніцтва па падпісцы і кожны калгасьнік падпісаўся на месячны заработак. Лявіцкі

Бярэце прыклад з Клімаўшчыны

Ужо прайшла дэкада з дня абвяшчэньня ўдарнага месячніка і больш паў месяца з дня пачатку кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы. Аднак, зьвесткі, якія на сёньня маюцца аб выніках рэалізацыі, са ўсёй яскравасьцю кажуць, што кампанія на вёсцы па цэлым радзе раёнаў яшчэ зусім не разгарнулася. Заданьне па сялянскім сэктары выканана ўсяго толькі на 8,8 проц.

Замест 16 млн. руб., прадугледжаных па пляну, рэалізавана 1.409 тыс. руб., пры чым тады, як па калгасах заданьне выканана на 34 проц., па аднаасобным сэктары рэалізавана ўсяго толькі 48 тыс. руб., што складае 0,4 проц. заданьня. Гэтыя лічбы кажуць аб наяўнасьці прарываў ў рэалізацыі пазыкі на вёсцы і вымушаюць біць трывогу.

Наяўнасьць прарыву тлумачыцца тым, што некаторыя раённыя арганізацыі недаацанілі ўсёй важнасьці рэалізацыі пазыкі на вёсцы і ў сувязі з гэтым ня сталі на чале кампаніі, не ма бліізавалі вакол яе шырокай грамадзкай думкі і не праводзяць шырокую палітычна-масавую работу; яны цалкам палажыліся на самацёк.

Чым-жа іншым, як не апартуністычнай бязьдзейнасьцю і недаацэнкай ўсёй важнасьці рэалізацыі пазыкі на вёсцы можна растлумачыць наяўнасьць прарыву?

У той час, калі Клімавіцкі раён выканаў заданьне па сялянскім сэктары на 109,1 проц., Менскі—на 63 проц., Койданаўскі—на 58,3 проц., Халопеніцкі—на 49,6 проц.,—Веткаўскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Гарадоцкі, Жыткавіцкі, Краснапольскі, Заслаўскі, Копыльскі, Лоеўскі, Мсьціслаўскі, Плешчанскі, Полацкі, Смалявіцкі, Узьдзянскі—сярод сялянскага сэктару не рэалізавалі ніводнай аблігацыі, а раёны: Быхаўскі выканаў заданьне па сялянскім сэктары ўсяго толькі на 5,6 проц., Бягомльскі—на 2,4 проц., Бярэзінскі—4,9 проц., Горацкі—5,2 проц., Дуброўенскі—1,3 проц., Жлобінскі—1,2 проц., Кармянскі—5,5 проц., Лёзьненскі—4,3 проц., Рэчыцкі—1,7 проц., Чэрвенскі—5,4 проц., Шклоўскі—1,7 проц.

Зусім бясспрэчным зьяўляецца тое, што Клімавіцкі раён, які, між іншым, па пастанове цэнтр. камісіі садзейнічаньня пры ЦВК БССР прэміруецца за лепшае правядзеньне рэалізацыі пазыкі на вёсцы, а калегія НКФ БССР ўзяняла хадайніцтва аб прэміяваньні Клімавіцкага раёну саюзнымі органамі), выканаў у кароткі тэрмін заданьне па рэалізацыі пазыкі на вёсцы таму, што ён хутка пераключыўся на работу ў вёсцы, што ён узяў баявыя тэмпы і сацыялістычныя мэтады работы, гораду перанёс на вёску, што ён, абапіраючыся на калгасы і ўдарныя калгасныя брыгады, мабілізаваў на гэту справу ўсю грамадзкасьць, што ён своячасова прывёў у баявую гатоўнасьць усе кампасоды, грамадзкіх інструктароў, а таксама і фінансава-крэдытны апарат. Іменна гэта, а ня што іншае, забясьпечыла раёну посьпех кампаніі, высунуўшы раён на першае месца ня толькі па БССР, а нават і па СССР. Гэты прыклад работы Клімаўшчыны павінны пад хапіць усе іншыя раёны БССР.

М. Рабцевіч.

Заданьне рэальнае —яго трэба выканаць

Ідучы насустрэч патрабаваньням цэлага раду калгасаў і саўгасаў, а таксама індывідуальнай бядняцка-серадняцкай часткі сялянства, акц. т-ва «Сельгасснабжэньне» выпусьціла машына-трактарныя абавязацельствы на агульную суму ў 50 млн. руб., з якіх па Беларусі неабходна рэалізаваць усяго 1.450.000 рублёў.

Абавязацельствы выпушчаны на вельмі ільготных умовах: пры падпісцы ўносіцца толькі адна трэцяя частка кошту той ці іншай машыны, а на астатнія дзьве трэція часткі прадстаўляецца крэдыт тэрмінам да 3-х год.

Здавалася-б, чаго-ж прасьцей: рэалізаваць абавязацельствы па раёнах, згодна кантрольных заданьняў цэнтру—і ўся справа. Але ня тут-та было. З матар'ялаў праверкі рэалізацыі гэтых абавязацельстваў па Віцебскім, Бешанковіцкім, Вульскім і Вушацкім раёнах выявілася, што там наглядаецца поўнейшая сьпячка ў гэтых адносінах; не вядзецца абсолютна ніякай растлумачальнай работы, існуе стаўка на самацёк.

Калі па Вушацкім раёне (пры наяўнасьці МТС) рэалізавана абавязацельстваў на 286 руб. 20 кап., дык па Бешанковіцкім і Вульскім раёнах амаль нічога не рэалізавана. Ня лепш справа абстаіць і ў Віцебскім раёне.

На папыраных нарадах пры райвыканкомах, якія праводзіліся ў радзе раёнаў (Вула, Бешанковічы, Вушачы) высьветлілася, што раённыя арганізацыі абмежаваліся пасылкай абежніка з кантрольнымі лічбамі і не ўтварылі нават праверкі рэалізацыі. Яны ня маюць ніякіх вестак аб тым, як ідзе рэалізацыя ў сельсаветах і калгасах. Калі некаторыя райкомы партыі (Вула, Вушачы) зьбіраюцца заслухаць на пасяджаньні бюро пытаньне аб ходзе рэалізацыі гэтых абавязацельстваў, дык Бешанковіцкі райком партыі зусім гэтым ня цікавіцца, заявіўшы прадстаўнику Белсельснабу, які прыбыў для правядзеньня праверкі хода рэалізацыі гэтых абавязацельстваў, што райкома гэта не датычыцца. Дайшло да таго, што прадстаўнік райкому партыі адсутнічаў на скліканай райвыканкомам нарадзе па даным пытаньні. І гэта ня гледзячы на дырэктыву ЦК КП(б)Б.

Калгасьнікі слухаюць даклад аб пазыцы «3-ці рашаючы» (Бешанковіцкі р.)

Кантрольнае заданьне па раёнах зьяўляецца зусім рэальным і магчымым для выкананьня, што прызналі усе нарады, скліканыя райвыканкомамі па гэтым пытаньні (Вула, Вушачы, Бешанковічы). Характарна, што ня гледзячы на маючыяся дырэктывы райкалгассаюзаў, рэалізацыя абавязацельстваў па калгасах ідзе чарагавымі тэмпамі, усе калгасы адгаворваюцца адсутнасьцю грошай і г. д.

— Сельска - гаспадарчыя машыны нам патрэбны, але грошай няма.

Вось адказ раду праўленьняў калгасаў. Да канца рэалізацыі засталіся лічаныя дні. Неабходна ўсім арганізацыям, якія прымаюць падпіску па гэтых абавязацельствах, узяцца за работу больш ударнымі, бальшавіцкімі тэмпамі.

Віцебск.

Заданьне перавыканалі

Гаркому КП(б)Б, Гарсавету

Кантрольныя лічбы па Калодзішчанскім сельсавету па рэалізацыі пазыкі імя 3 рашаючага году пяцігодкі перавыкананы.

Падпіска працягваецца

Упаўнаважаны БЕРМАН.
Сакратар ячэйкі ЛЯХОЎСКІ.
Старшыня с.-с. ЛАПАЦІН.

* * *

Па ініцыятыве саматужніка Басава Ісака праведзена падпіска на пазыку «3-ці рашаючы» па Чачэрскай шавецкай арцелі на месячны заработак. Па кравецкай арцелі падпіска на пазыку праведзена ў большасьці на месячны заработак.

Р—н.

Тэмпы перабудовы

спажывецкай кааперацыі не дастатковыя

У часе агляду—зьнішчыць апартунізм, перабудаваць работу кааперацыі ва ўсіх яе зьвеньнях

На Аршаншчыне ня рыхтуюцца да спатканьня гародніны

Сельская гаспадарка Аршанскага раёну мае садова-гародны і жывёлагадоўчы напрамак. На раёне налічваецца 34 садова-гародных калгасаў. Яны павінны даць працоўнаму насельніцтву гораду патрэбную гародніну. Праўда, калгасы Аршанскага раёну яшчэ самі ня змогуць задаволіць запатрабаваньні на гародніну і таму значная частка гародніны ў Воршу будзе дастаўляцца і з суседніх з Аршаншчынай раёнаў. Пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны ўпэўнівае нас у тым, што гародніна рабочым будзе. Зараз галоўная задача—гэта добра падрыхтавацца да спатканьня гародніны да загатовак, бо ўборка ўжо не за гарамі.

Паглядзім, як-жа Аршанскія калгасна-кааперацыйныя арганізацыі і рабочыя кааператывы рухтуюцца да спатканьня гародніны?

Райспажыўсаюз і ня думае аб гародніне

Працаўнікі Аршанскага Райспажыўсаюзу, калі ў іх запытаеш аб падрыхтоўцы да спатканьня гародніны,—адказваюць:

— Гэта ня наша справа. Мы загатоўкай гародніны і яблыкамі ня займаемся. Гэта справа Райкаапсаюзу.

І таму Райспажыўсаюз ня мае ніякага пляну загатовак гародніны. Аршанскі Райспажыўсаюз таксама нічога не зрабіў і ў напрамку забесьпячэньня гародніннай тых яго сталовак, якія знаходзяцца ў калгасах і саўгасах. Райспажыўсаюз лічыць, што калгасы маюць гародніну і таму яму нечага аб ёй клапаціцца для сталовак. Такое самае становішча і са сталоўкамі, якімі Райспажыўсаюз абслугоўвае рабочых розных будаўніцтваў у сельскай мясцовасьці. Забесьпячэньне сталовак сельскай спажывецкай кааперацыі гародніннай,—адасцца цалкам справа Райспажыўсаюзу, але ён аб гэтым і ня думае і нічога ня робіць.

Наогул Аршанскі Райспажыўсаюз ня рыхтуецца да ўборачнай кампаніі. А між тым, ён павінен арганізаваць на час палявых работ, асабліва-ж на час уборкі, сталоўкі ў калгасах і арцельнае харчаваньне. У гэтым напрамку нічога ня зроблена.

Сваю бязьдзейнасьць работнікі Райспажыўсаюзу тлумачаць так:

— Калгасы не жадаюць, каб у іх арганізавалі сталоўкі, дык што-ж нам рабіць?

А на справе крыху ня так. У калгасе «Чырвоны бераг» райспажыўсаюз павінен арганізаваць сталоўку і калгасьнікі яе вельмі чакаюць. Яны дзівяцца, чаму ўсё няма сталоўкі. На справе выходзіць наадварот: не калгасьнікі не жадаюць сталовак, а райспажыўсаюз ня хоча іх адчыняць.

Кантора Белплодагародніны ня кіруе падрыхтоўкай да ўборкі

Аршанская кантора Белплодагародніны абслугоўвае 11 раёнаў, у тым ліку і Аршанскі. Яна сама непасрэдна загатовак не вядзе, але павінна кіраваць гэтай справай у тых раёнах, якія яна абслугоўвае. Так павінна быць, але ня так ёсьць на справе.

Гаворачы аб загатоўках гародніны, трэба спыніцца на кантрактацыі яе, бо кантрактацыя—найлепшы спосаб загатоўкі. Наогул, пляны кантрактацыі гародніны перавыкананы, але гэта перавыкананьне ідзе за кошт Ляднянскага, Круглянскага і іншых раёнаў, якім заданьні па кантрактацыі гародніны не даваліся. У раёнах якім даваліся заданьні па кантрактацыі гародніны, пляны кантрактацыі значна недавыкананы. Так, плян кантрактацыі капусты выкананы на 86 проц., гуркоў—на 65 проц., моркавы—на 63 проц., цыбулі—на 68 проц., памідораў—на 26 проц. і садавіны—на 50 проц. Недавыкананьне пляну па кантрактацыі гародніны тлумачыцца недастатковасьцю кіраўніцтва гэтай справай з боку Канторы і з боку Райкаапсаюзаў, якія перавыканаўшы пляны па кантрактацыі зярнёвых культур, зусім спынілі работу па кантрактацыі гародніны, ня гледзячы на тое, што пляны па ёй недавыкананы.

Для снабжэньня рабочых гораду Воршы і прадпрыемстваў раёну, Аршанская кантора Белплодагародніны павінна даць: бульбы—5.800 тон, капусты—268 тон, буракоў—56 тон, гуркоў—136 тон, яблыкаў—148 тон. Для рабочых чытункі праз ТПО яна павінна даць: 5350 тон бульбы, 1107 тон капусты, 380 тон буракоў, 245 тон моркавы, 385 тон гуркоў і 392 тоны яблыкаў. Гэта ўсё павінна даць тыя раёны, якія абслугоўваюцца канторай Белплодагародніны. А што робіцца на раёнах, як яны рыхтуюцца да спатканьня гародніны, ці ёсьць у іх тара, памяшканьні, транспарт для перавозкі, як там ідзе праполка і як наспул рыхтуюцца да ўборкі і да загатовак гародніны,—Аршанская кантора Белплодагародніны нічога ня ведае. А між тым, тут справы абстаяць ня зусім добра. Напрыклад, Аршанскі ЦРК яшчэ не зрабіў умову з Белкаапсаюзам на снабжэньне яго гародніннай. Таксама ЦРК не зрабіў умовы з Кохнаўскім раёнам, які павінен даць гародніну для рабочых Воршы. Аршанскае ТПО, ня маючы да гэтага часу хавальнікаў і не будуючы іх, не жадае заключаць умову з Клімавіцкім і Касьцюковіцкім раёнамі. Такім чынам, тут можа быць упаўне зрыў снабжэньня рабочых Аршанскага вузла гародніннай. Праўда, праўленьне ТПО тлумачыць сваё адмаўленьне заключаць умову нібы тым, што гародніны ў яго хопіць, а на справе гэта ня так, і гародніны будзе мала. Толькі ТПО, ня маючы хавальнікаў, баіцца заключыць умову...

Аршанская Кантора Белплодагародніны для абслугоўваньня раёнаў, мае толькі 5 інструктароў, ды і тыя працуюць яшчэ толькі без году тыдзень, бо тры з іх нядаўна прыехалі з курсаў, а астатнія два рабочыя выдвуненцы. Зразумела, што для таго, каб кантора магла добра кіраваць падрыхтоўкай да спатканьня гародніны, яе ў першую чаргу трэба ўмацаваць работнікамі.

У АЦРК—цішыня

Па заданьні Белкаапсаюзу, Аршанскі ЦРК павінен быў у гэтым годзе пасадзіць на сваіх прыгарадных сельскіх гаспадарках 230 га гародніны. Сельска-гаспадарчы сэктар АЦРК гэта заданьне зьменшыў да 210 га, з прычыны таго, што для гораду ня было столькі падрыхтаванай глебы. Пляны па засеву гародніны па асобных культурах АЦРК недавыкананы, асабліва па гуркох. Замест 20 га, як гэта мяркавалася па пляну, гуркоў пасаджана ў гаспадарках АЦРК толькі 13 га.

Падрыхтоўка да спатканьня гародніны і да захаваньня яе на зімовы час ЦРК яшчэ не праводзіць. Старыя хавальнікі—на падрыхтаваны і не адрамантаваны. Прыгарадныя гаспадаркі нават ня маюць ніякіх паказаньняў з боку праўленьня ЦРК аб падрыхтоўцы да ўборкі гародніны. На другой прыгараднай гаспадарцы АЦРК пабудаваны быць пабудаваны новы хавальнік, але для яго пабудовы яшчэ толькі зараз лес возяць. Нічога ня думаюць і аб квасільных пунктах. На першай гаспадарцы маецца чанаў на 100 тон капусты, але гэтага недастатковa. Патрэбна яшчэ некалькі новых і аб гэтым ніхто не клапоціцца. Таксама няма і засолачных пунктаў.

Сэктар Снабжэньня яшчэ ня мае пляну патрэбнай колькасьці гародніны. Ён толькі мяркуе сабраць са сваіх гаспадарак: гуркоў—234 тоны, сталовых буракоў—399 тон, капусты—680 тон. Маецца таксама заключаны ўжо дагавор на пастаўку 3000 тон бульбы, 298 тон капусты, 35 тон сталовай моркавы, 56 тон сталовых буракоў і 40 тон яблык для грамадзкага харчаваньня. Па разнарадзе Белкаапсаюзу, Аршанскі Райкаапсаюз павінен даць яшчэ АЦРК 136 тон гуркоў, але ён ад гэтага адмаўляецца, бо зрабіў умову на гэтыя гуркі з ТПО. Праўленьне ЦРК марудзіла, і такім чынам у яго гуркоў ня хопіць ня толькі для снабжэньня наогул, але і для грамадзкага харчаваньня.

Сэктар грамадзкага харчаваньня АЦРК ня ведае, калі, колькі і ад каго ён павінен атрымаць гародніну, ня мае хавальнікаў для яе і не рухтуе іх.

Да прапалачнай кампаніі АЦРК вельмі мала мае рабочай сілы. Праўда, вярбоўшчыкі высланы, але яны яшчэ нічога рэальнага не зрабілі. На час праполкі, толькі для аднэй 2-й гаспадаркі патрэбна ня менш 7.000 чалавека-дзён рабочых, а іх маецца ўсяго 1.600. Патрэбна дапамога прафсаюзаў. Саюзы заключылі ўмовы з ЦРК, але вельмі дрэнна іх выконваюць.

На рабоце прыгарадных гаспадарак АЦРК адбіваецца яшчэ і тое, што там рабочыя не забясьпечаны жыльлёвым памяшканьнем; дрэнна на гаспадарках арганізавана грамадзкае харчаваньне, не наладжана і снабжэньне рабочых прыставарамі. На другой гаспадарцы ЦРК харчы рабочым дастаўляюцца ў поле халодныя, і часамі дрэнная якасьці. А між тым, магчымасьці арганізаваць прамаджкае харчаваньне для рабочых прыгарадных гаспадарак—маюцца.

Прыгарадныя гаспадаркі АЦРК да ўборкі гародніны яшчэ ня рыхтуюцца і не забясьпечаны ўборачным інвэнтаром. Няма бульбакапалак, няма тары—кошыкаў, скрынак і г. д. Заяўкі на тару ЦРК яшчэ не даваў. Сярод рабочых гаспадарак амаль не вядзецца масавая работа. Партыйная ячэйка ЦРК пытаньнямі ўборкі не займалася і ўвагу рабочых прыгарадных гаспадарак і ўсіх работнікаў ЦРК на гэтым пытаньні не завастрыла.

Вялікае значэньне ў пасьпяховасьці ўборкі і прыёмкі гародніны мае тара, але тут яшчэ амаль нічога ня зроблена. Абвешчаны месячнік па збору тары, пачаўся са спазьненьнем. Аб гэтым толькі ў палове чэрвеня загавары лі. І то гэта толькі ў напрамку збору мяшкоў, а аб астатняй тарэбнай тары не клапоцяцца. А калі прыдзе час ўборкі гараднины,—патрэбны будуць і скрынкі і кошыкі, чаго ні адна арганізацыя Аршаншчыны яшчэ ня мае.

Падрыхтоўку да спатканьня гародніны на Аршаншчыне трэба выцягнуць з балота апартуністычнага самацёку, і паставіць на сапраўдныя бальшавіцкія рэйкі ўдарных тэмпаў.

А. Кудрын.

Ператварым сталіцу БССР у горад суцэльнай пісьменнасьці

Прапанову рабочых заводу імя Варашылава прымаем—адкрываем усебеларускую канфэрэнцыю—пераклічку па пытаньні адзінага культпляну

Рабочыя „Камунара“, „Гомсельмашу“ і „Чырвонага Мэталіста“, адказвайце на выклік варашылаўцаў

Варашылаўцы заклікаюць рабочых Менску

ўзяцца за ператварэньне сталіцы БССР у горад суцэльнай пісьменнасьці

(ПАСТАНОВА АГУЛЬНАГА СХОДУ РАБОЧЫХ І ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ МАШЫНА-БУДАЎНІЧАГА ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА).

Абгаварыўшы адозву Усебеларускага штабу культэстафэты і заклік перадавікоў-ударнікаў культурнай рэвалюцыі—буйнейшых фабрык і заводаў Савецкага Саюзу і БССР, агульны сход 1200 арміі рабочых, работніц, інжынэраў і тэхнікаў машына-будаўнічага заводу імя Кліма Варашылава ваш заклік тт. рабочыя-ударнікі культурнай рэвалюцыі заводаў імя Лепсе, электразаводу «Серп і Молат» (Масква), «Камінтэрн» (БССР) і іншых буйнейшых фабрык і заводаў Саюзу мы прымаем з свайго боку абавязваемся ператварыць машына-будаўнічы завод імя Варашылава ў цытадэль, кожны цэх—у апорную базу, кожную рабочую брыгаду—у баявы атрад культурнай рэвалюцыі.

Пастаўленыя перад краінай гістарычныя задачы—у найкарацейшы тэрмін дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны—ускладаюць на ўсіх рабочых, калгасьнікаў, інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў і ўсіх працоўных Савецкага Саюзу і ў тым ліку на нас гераічныя абавязкі: барацьба за высокія тэмпы будаўніцтва сацыялізму, за якасьць, за тэхніку, за культурную рэвалюцыю.

Пасьпяховае вырашэньне гэтай задачы немагчыма без аўладаньня ўсімі рабочымі, калгасьнікамі і працоўнымі тэхнікай сацыялістычнай культуры, без паталоўнай ліквідацыі агульнай тэхнічнай непісьменнасьці.

У мэтах пасьпяховага і поўнага ажыцьцяўленьня пастаўленых партыяй і ўрадам задач культурнага будаўніцтва, мы абавязваемся неадкладна пасадзіць усіх непісьменных і малапісьменных рабочых і работніц за кніжку з тым, каб да 1 верасьня ператварыць наш завод—у завод суцэльнай пісьменнасьці. Мы заклікаем усіх рабочых горада Менску ўзяцца за справу ператварэньня Менску—сталіцы БССР у горад суцэльнай пісьменнасьці.

Даючы сустрэчныя пляны барацьбы за культурную рэвалюцыю, мы бярэм на сябе наступныя абавязацельствы.

1) Уключыцца ў двухдзесяцідзённік трывогі па ліквідацыі прарываў на фронце выкананьня культпляну і ў падрыхтоўцы да навучальнага году, мабілізаваць усіх рабочых і ўцягнуць іх у справу практычнага вырашэньня задач культурнага будаўніцтва шляхам шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, окрасных брыгад, узяцьце на грамадзкі буксір і т. д.

2) У час 2-х дэкадніка правесьці шырокую вярбоўку рабочых, у рады культармейцаў, мабілізаваўшы на нашым заводзе ня менш 100 чалавек культармейцаў.

3) Арганізаваць 2 апорных культцэхі ператварыўшы іх у апорныя вядучыя базы культпаходу, арганізаваць 10 ударных культбрыгад.

4) Арганізаваць ва ўсіх цэхах кароткатэрміновыя курсы сэмінары па падрыхтоўцы культкадраў. Замацаваць усіх культармейцаў на практычнай галіне культработы і за сталымі культпалітасьвет установамі.

5) Узяць на вучот і паслаць у школы ўсіх падлягаючых усеагульнаму абавязковаму навучаньню, устанавіць сталы грамадзкі кантроль за іх вучобай, дабіцца, каб ніводнага рабочага, работніцы і іх дзяцей не заставіць па-за школай.

6) Ахапіць масавай вытворча-тэхнічнай вучобай усіх рабочых, падняўшы працу па тэхнічнай вучобе на вышэйшую ступень, арганізаваўшы спэцыяльна-вытворча-тэхнічную школу для сярэдняга камскладу вытворчасьці—майстраў, брыгадзіраў, ударнікаў, выканходцаў і іншых кваліфікаваных груп рабочых.

7) Арганізаваць суцэльнае культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых, асабліва вячэрніх і начных зьмен паставіўшы іх у гэтых адносінах у адноль кавыя ўмовы з рабочымі дзённых зьмен.

8) Перабудаваць работу клюбу, бібліятэкі, радыяфікаваць усе цэхі, арганізаваць масавае кіно-абслугоўваньне ўсіх зьмен.

9) На працягу 2-х дэкадніка штурму распрацаваць адзіны плян культбудаўніцтва, аформіць «культпалітсавет, склікаць шырокі пленум і правесьці шырокую канфэрэнцыю культармейцаў.

10) Падрыхтаваць усе ўмовы да арганізацыі дзіцячага саду і ясьляў з тым, каб ахапіць імі ўсіх дзяцей рабочых і работніц, перавёўшы работу дашкольных устаноў на зьменную работу і бесьперапынку.

11) Адобрыць і цалкам прыняць заклік рабочых заводу «Камінтэрн». Распрацаваць і ажыцьцяўляць высунутыя камінтэрнаўцамі мерапрыемствы па політэхнізацыі савецкай школы: арганізаваць ударную брыгаду, спэцыяльны вучэбны цэх, правесьці збор прылад і інструментаў, зрабіць школу вучэбным цэхам заводу.

12) Прасіць рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» адкрыць Усебеларускую завочную канфэрэнцыю—пераклічку прадпрыемстваў па пытаньні барацьбы за выкананьне культпляну, за адзіны культплян, за разгорнутую падрыхтоўку да навучальнага году.

У Прэзыдыум Усебеларускай канфэрэнцыі мы запрашаем тт. Галадзеда, Чарвякова, Рыкова, Шаранговіча, Сакратара Менскага Гаркому КП(б)Б Шпэктарава, Старшыню Гарпрафсавету Шулькіна і рэдактара газэты «Савецкая Беларусь» т. Шастакова.

За ўдарныя тэмпы работы па ажыцьцяўленьні высунутых намі прапаноў выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва рабочых, работніц, інжынэрна тэхнічны пэрсанал машына-будаўнічых заводаў Гомсельмаш, «Чырвоны Мэталіст», «Камунар». Арбітрам высоўваем газэты «Савецкая Беларусь», «Зьвязда», «Палеская Праўда» і «ЗКП».

Прапануем заўкому на працягу 5-ці дзён арганізаваць культштаб і распрацаваць каляндарны плян ажыцьцяўленьня гэтых мерапрыемстваў.

Таварышы, мы ўпэўнены, што заклік перадавікоў - ударнікаў культурнага фронту—буйнейшых заводаў СССР БССР знойдзе самае актыўнае падтрыманьне з боку ўсіх рабочых, работніц, калгасьнікаў, інжынэрна-тэхнічных, культасьветных сіл і ўсіх працоўных горад Менску і ўсёй Савецкай Беларусі і што гэты заклік зьявіцца пачаткам мабілізацыі і ўключэньня ўсіх працоўных у вялікі гістарычны паход за культурную рэвалюцыю.

Ператворым Савецкую Беларусь краіну суцэльнай пісьменнасьці!

Пралетары, калгасьнікі і ўсе працоўныя,—усе ў рады культармейцаў, усе на барацьбу за культурную рэвалюцыю!

Няхай жыве КП(б)Б—адзіны арганізатар і кіраўнік культурнага будаўніцтва ў БССР.

Прэзыдыум сходу-мітынгу рабочых і інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў заводу імя Варашылава.

Запісаны для выступленьня на канфэрэнцыі—пераклічцы

«Усебеларуская культнарада фабзаўмясцкомаў, прадпрыемстваў, саўгасаў, МТС і райгарпрафсаветаў, заслухаўшы інфармацыю прадстаўніка рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» аб усебеларускай завочнай канфэрэнцыі—перклічкі, адкрываній газэтай «Изв. Бел.» па пытаньні аб адзіным культпляне, пастанавіла:

1) Вітаць ініцыятыву рабочых заводу імя Варашылава і пачын газэты «Савецкая Беларусь», як найкаштоўнейшае мерапрыемства па абмене вопытам і аказаньні дапамогі нізавым ячэйкам прафсаюзаў у справе перабудовы культработы ў адпаведнасьці з задачамі трэцяга рашаючага году пяцігодкі, у справе пабудовы адзінага культпляну і барацьбы за яго.

2) Прасіць рэдакцыю «Сав. Бел.» уключыць у прэзыдыум завочнай канфэрэнцыі загадчыка культсэктарам ЦСПСБ тав. Клімковіча, культарганізатараў гарпрафсаветаў — Гомельскага тав. Германа, Віцебскага—тав. Кабішчара і Плешчаніцкага сельскага райпрафсавета тав. Гурэвіча.

3. Прасіць прэзыдыум канфэрэнцыі даць слова культсэктару ЦСПСБ, Гомельскаму, Віцебскаму, Мазырскаму і Плешчаніцкаму прафсаветам, а таксама ма Капцэвіцкай фабрыцы «Зьвязда», Бабруйскаму дрэваапрацоўчаму камбінату, Менскім заводам «Камунар»» і «Бальшавік», Жыткавіцкай фабрыцы «Чырвоная Зорка», Барысаўскім фабрыкам «Чырвоная Бярэзіна» і Камінтэрн», Віцебскім—фабрыцы «Дзьвіна» і заводу «Чырвоны Мэталіст», Магілеўскім —фабрыцы штучнага валакна і скураэаводу імя Сталіна, Гомельскім заводам «Пралетары», Гомсельмаш і абутковай фабрыцы «Труд» Койданаўскай МТС, саўгасам: «Х-годзьдзе БССР», «Банонь» і «Багоннае».

Прэзыдыум Усебеларускай культнарады.

СТВАРЫЦЬ МОЦНУЮ КАРМОВУЮ БАЗУ

Сабраць 2.800 тысяч тон сена, 378.572 тоны канюшыны, засіласаваць ня менш 1 мільёну тон зялёнай масы

Пасеяць як мінімум 5.000 га пажніўных культур

Пра забясьпечаньне жывёлы кармамі з ураджаю 1931 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Ня гледзячы на асаблівае значэньне, якое набывае справа разьвіцьця жывёлагадоўлі ў БССР, паасобныя арганізацыі і ўстановы і раённыя выканаўчыя камітэты да гэтага часу не ўявілі сабе ўсяе гаспадарча-палітычнай важнасьці гэтай справы і не паставілі на мэце поўнае ажыцьцяўленьне ўсіх мерапрыемстваў, зьвязаных з пасьпяховым разьвіцьцём жывёлагадоўлі, у выніку чаго ня выкананы плян па правасеяньні і сіласаваньні, ня выкананы праграма па палепшаньні натуральных сенажацяй і пасеву кораньплодаў, бесгаспадарча скарыстоўваюцца сенажаці, бескантрольна і зусім нерацыянальна скарыстоўваюцца кармы ўсіх відаў і інш., што шкодна адбіваецца на пасьпяховым разьвіцьці жывёлагадоўлі.

Выходзячы з задач сацыялістычнай рэканструкцыі жывёлагадоўлі і падвышэньня яе прадукцыйнасьці на базе масавай арганізацыі саўгасаў і калгасаў, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Паставіць задачаю ўсіх савецкіх і грамадзкіх арганізацый рэспублікі дабіцца якаснага і колькаснага павялічэньня кармовай прадукцыі ў 1931-1932 г. праз своячасовую і поўную ўборку сена, сіласаваньне кармоў, разьвядзеньне кармавога насеннаводзтва і максымальна - эканомнае і строга - рацыянальнае расходваньне кармоў.

2. Агульны збор лугавога сена ў БССР вызначыць у 2.800 тыс. тон, з якіх па лініі Белсельтрэсту—38.000 тон, Белкаапсаюзу — 12.000 тон, трэсту «Сьвіназавод»—30.000 тон, Насентрэсту—6.000 тон, Маслатрэсту—18.000 тон, Лёнжаканапляводтрэсту — 5.000 тон, фэрм навучальных і дасьледчых устаноў—1.000 тон, Саюзпрамкорму—25.000 тон, калгасаў—1.200 тыс. тон, індывідуальнага сэктару—1.477 тыс. тон (па становішчы калектыўн. гаспадарак на 1-VII-31 г.), пры чым вызначаныя заданьні лічыць мінімальнымі, абавязаўшы трэсты і калгасна-кааперацыйную сыстэму дабіцца перавыкананьня ўстаноўленых пляноў праз збор 2-х укосаў на заліўных сенажацях і ўборкі сена з усіх сенажацяй незалежна ад іх якасьці.

Мінімальны агульны збор канюшыны ў БССР вызначыць у 378572 тоны, у тым ліку ў саўгасах,—30260 тон, у калгасах—169662 тоны і ў аднаасобным сэктары—187650 тон, аднагадовых траў (вікі і сэрадэл.) 366648 тон, у тым ліку ў саўгасах—58154 тоны, у калгасах—98607 тон і ў аднаасобным сэктары—209887 тон.

3. Абавязаць усе цэнтральныя ўстановы і арганізацыі, раённыя выканаўчыя камітэты, дырэктараў саўгасаў і старшынь калгасаў, арганізаваць уборку сена ў тэрміны вызначаныя пастановаю Калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства БССР за 1-VI-1931 г. з тым, каб, цалкам забясьпечаючы прубымі кармамі ўсё паталоўе жывёлы на ўвесь стойлавы пэрыяд 1931-32 г., стварыць рэзервовы фонд прубых кармоў ня менш 20 проц. ад фактычнай гадавой патрэбы ў ім.

4. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты забясьпечыць давядзеньне пляну ўборкі сена да кожнага саўгаса, калгаса і паселішча, устанаўлёўшы сталы нагляд за ўборкаю сена. Адказваць за своячасовае і поўнае выкананьне пляну ўборкі сена ў раёнах дзейнасьці машынна-трактарных станцый, побач з кіраўнікамі, калгасаў, ускласьці на дырэктараў машынна-трактарных станцый.

5. Абавязаць усе сельскагаспадарчыя трэсты, Белкалгасцэнтр і раённыя выканаўчыя камітэты забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне выдзельнічыньня на ўсіх відах работ сенаўборкі. Стварыць спэцыяльныя сенаўборачныя брыгады, замацаваўшы за ім. адпаведныя плошчы.

6. Абавязаць Белсельснаб скозчыць запоз ў саўгасы і калгасы сенаўборачнага інвэнтара не пазьней 15 ліпеня, а Белкалгасцэнтр і сельскагаспадарчыя трэсты забясьпечыць максымальнае скарыстаньне сенаўборачных машын.

7. Для пасьпяховага і найбольш поўнага ахопу сенаўборкаю плошчаў Беларускага Аддзяленьня Саюзпрамкорму, Белсельтрэсту, Лёнжаканапляводтрэсту і Маслатрэсту, абавязаць Народны Камісарыят Снабжэньня павялічыць завоз прамысловых тавараў і прадуктаў харчаваньня для лепшага забясьпечаньня рабочых на сенаўборцы.

8. Плян сіласаваньня ў 1.000.000 тон лічыць мінімальным і абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты наўхільна сачыць за поўным выкананьнем пляну сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня, ужываючы ўсе мерапрыемствы для забясьпечаньня яго выкананьня.

9. Улічваючы дэфіцытнасьць будаўнічых матарыялаў, абавязаць кіраўніцтвы калгасаў і дырэктараў саўгасаў забясьпечыць поўнасьцю праграму сіласаваньня за лік самых простых установак як траншэй, вежы павінны зьявіцца рэзэрвам.

Устанавіць наступныя тэрміны выкананьня праграмы сіласаваньня: да 1-VIII-31 г.—30 проц., з 1

За 1 мільён тон сілосу

Крута ўзьняць тэмпы сіласаваньня

Да 10 ліпеня калгасы засіласавалі толькі 1,4 проц. пляну, будаўніцтва сіласных установак выканана на 12,1 проц.

Зруйнаваць усе перашкоды на шляху стварэньня кармовай базы. Масавым уключэньнем раёнаў, сельсаветаў, МТС, калгасаў і саўгасаў у конкурс на лепшае правядзеньне сенааборачнай і сіласнай кампаніі, дабіцца да 1 жніўня г. г. выкананьня 30 проц. гадавога пляну сіласаваньня

Дабіцца пералому ў сіласаваньні

На 10-га ліпеня плян сіласаваньня кармоў выканан толькі на 0,4 проц., між тым як на працягу чэрвеня трэба было засіласаваць ня менш 10 проц. гадавога пляну. Таксама дрэнна праходзіць будаўніцтва сіласных установак—ям і траншэй. Плян па іх выканан на 3,4 проц. Калгасная сыстэма паводле вестак з 46 раёнаў выканала плян сіласаваньня на 1,4 проц., будаўніцтва—12,1 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб зрыве пляну раньняга сіласаваньня, што ставіць пад пагрозу выкананьне агульнага пляну. Вось чаму зараз павінны быць ужыты рашучыя захады каб зламаць недаацэнку і нядбайнасьць у адносінах правядзеньня сіласнай кампаніі. Набходна дабіцца каб на працягу ліпеня пакрыць прарывы чэрвеня і першай паловы ліпеня.

Усебеларускі конкурс на правядзеньне сенааборачнай і сілосной кампаніі, абвешчаны НКЗ БССР павінен зьявіцца магутным штурхачом у справе стварэньня моцнай кармовай базы. Калгасы, саўгасы і аднаасобны сэктар павінны па сапраўднаму павярнуцца тварам да сіласнай кампаніі.

На правядзеньне сіласаваньня кармоў трэба мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў. Неабходна забясьпечыць усямерную дапамогу з боку партыйна-камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый у правядзеньні сілосной кампаніі.

На 1-га жніўня чаго-б гэта ні каштавала неабходна дабіцца выкананьня ня менш 30 проц. гадавога пляну па сіласаваньні.

Аб чым дбае Пухавіцкі райкалгассаюз?

Сіласаваньне кармоў у Пухавіцкім раёне яшчэ не пачыналася. Сілосныя ямы яшчэ не пабудаваны. У калгасах імя 16 Партызан, «Чырвоны Партызан», «Праца», «Дружба», імя ЦВК, X Зьезду ЛКСМБ, «Савецкая Беларусь», «Чырвоная Зьмена», імя Дзяржынскага, «Зьвязда», імя Леніна, імя Сталіна і іншыя павінны былі будаваць сілосныя ямы, але пакуль што да будаўніцтва ня прыступілі.

Па аднаасобным сэктары таксама нічога ня робіцца па сіласаваньні кармоў. Па ўсім раёне не пачата будаўніцтва ніводнай сілосной ямы. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі раёну не дапамагаюць правядзеньню сіласаваньня кармоў. Некаторыя камсамольцы разважаюць, што сіласаваньне гэта другарадная справа, што «У нас ёсьць больш важныя справы». Ніводная камсамольская арганізацыя не ўзялася за гэту справу.

Пухавіцкія раённыя арганізацыі павінны рашуча павярнуцца тварам да жывёлагадоўлі. Трэба зараз-жа ўключыцца ў конкурс на лепшае правядзеньне сенааборкі і сілосной кампаніі.

Ц. Лявіцкі.

Плян раньняга сіласаваньня сарваны

БАБРУЙСК. (Наш карасп.). Правядзеньне раньняга сіласаваньня па раёне сарвана. Згодна пляну трэба было засіласаваць да гэтага часу 13 тысяч тон сіласу, але фактычна нічога ня зроблена. Толькі адзін калгас «Камуніст» засіласаваў 50 тон эллёнай масы.

Калгасы не скарысталі пустазельля і іншых расьлін для правядзеньня сіласаваньня. Па прыкладзе мінулага году з боку большасьці калгасаў наглядаецца поўная недаацэнка і ігнараваньне сіласаваньня кармоў.

Раённыя арганізацыі павінны прыняць усе меры да таго, каб па баявому разгарнуць сіласаваньне кармоў, каб забясьпечыць выкананьне агульнага пляну сіласаваньня.

Д. Аланскі.

Да 1-га жніўня засіласаваць ня менш 30 проц. гадавога пляну

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру БССР аб ходзе сілоснай кампаніі

1. Ня гледзячы на вялізарнейшае значэньне, якое мае сілосная кампанія ў пытаньні стварэньня неабходнай кармовай базы для жывёлагадоўлі, на цяжкі вурок мінулай вясны, на рад самых катэгарычных пастаноў цэнтральных партыйных і ўрадавых органаў на пытаньні правядзеньня сілоснай кампаніі—калгассаюзы да апошняга часу не ўсьвядомілі ўсёй важнасьці пасьляховага правядзеньня сілоснай кампаніі, не паставілі яе ў рады важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўраду і не мабілізавалі на яе практычнае выкананьне шырокія масы калгасьнікаў.

2. На 10-VII весткі аб ходзе сілоснай кампаніі паступілі толькі ад 46 раёнаў.

Паводле даных гэтых раёнаў, плян падрыхтоўкі сілосных установак—ям і траншэй выкананы толькі на 12,1 проц, а засіласавана корму ўсяго 1,4 проц. ад іх гадавога заданьня. Між тым, да жніўня плян сіласаваньня павінен быць выкананы на 30 проц. Калгассаюзы: Быхаўскі, Брагінскі, Будакашалёўскі, Бягомльскі, Веткаўскі, Гомельскі, Глускі, Дубровенскі, Жлобінскі, Жыткавіцкі, Лоеўскі, Любаньскі, Мазырскі, Менскі, Петрыкаўскі, Рагачэўскі, Уваравіцкі не далі никіх вестак аб ходзе сіласаваньня з пачатку кампаніі.

Адзначанае становішча пагражае зрывам намечаных плянаў сіласаваньня.

Праўленьне Калгасцэнтру БССР катэгарычна прапануе:

1. Пад пэрсанальную адказнасьць старшынь калгассаюзаў на працягу 3-х дзён дабіцца рашучага пералому ў практычным ходзе сілоснай кампаніі, які-б забясьпечыў 100-процантнае выкананьне раённых плянаў, усклаўшы пэрсанальную адказнасьць за выкананьне плянаў па калгасах на старшынь праўленьня калгасаў.

2. На працягу ліпеня пакрыць прарывы чэрвеня і першай паловы ліпеня, засіласаваўшы да 1-га жніўня ня менш 30 проц. гадавога пляну, скарыстоўваючы ўсямерна ў якасьці сілоснай масы пустазельле.

Да гэтага тэрміну трэба поўнасьцю выканаць гадовае заданьне па будаўніцтве і прыстасаваньні ям і траншэй, выходзячы з разьліку засіласаваць у гэтых прасьцейшых устаноўках увесь гадавы плян.

3. Выходзячы з абавязковага выкананьня плянаў сіласаваньня і пабудовы сілосных установак у вызначаныя тэрміны, даць калгасам цьвёрдыя підзённыя заданьні па копаньні ям, траншэй і сіласаваньні, патрабуючы рэгулярных справаздач, устанавіўшы непаслабны жывы кантроль за іх выкананьнем.

У далейшым забясьпечыць такія тэмпы, каб у жніўні было засіласавана 35 проц., у верасьні - 33 проц. і ў кастрычніку рэшту 35 проц. гадавога пляну.

4. Зараз-жа мабілізаваць і правесьці ў парадак усю наўнасьць сілосарэзак і сячкарняў, пераводзячы іх на бесперапынную работу.

5. Абавязаць калгасы зараз-жа арганізаваць спэцыяльныя сілосныя брыгады на аснове зьдзельшчыны, практыкуючы шырокае ўжываньне сацыялістычных мэтадаў працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, прэміруючы лепшыя калгасы, брыгады, ударнікаў.

6. За непрадстаўленьне вестак аб ходзе сіласаваньня паставіць на від старшыням наступных калгассаюзаў: Быхаўскага, Брагінскага, Будакашалёўскага, Бягомльскага, Веткаўскага, Гомельскага, Глускага, Дубровенскага, Жлобінскага, Жыткавіцкага, Лоеўскага, Любаньскага, Мазырскага, Менскага, Петрыкаўскага, Рагачэўскага, Уваравіцкага і папярэдзіць старшынь усіх калгасаў, што калі па зводцы на 20-VII г. г. ня будуць дасягнуты тэмпы сіласаваньня, якія-б забясьпечвалі выкананьне раённага пляну, яны (старшыні) будуць прыцягнуты да адказнасьці за зрыў сілоснай кампаніі.

7. Нятрымсылка вестак аб ходзе сілоснай кампаніі ва ўстаноўленыя тэрміны (10, 20 і 30 кожнага месяца) будзе разглядацца як неправядзеньне работы па сіласаваньні, з усімі выцякаючымі з гэтага вынікамі.

Намесьнік старшыні праўленьня Калгасцэнтру БССР Стрэле.

15 ліпеня 1931 году.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра скасаваньне палажэньня пра рабоча-сялянскую міліцыю і крымінальны вышук БССР

У сувязі з выданьнем СНК БССР Палажэньня аб Рабоча-Сялянскай Міліцыі (З. З. СССР 1931 г., № 33, паст. 247), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць: скасаваць зацьверджанае ЦВК і СНК БССР Палажэньне пра Рабоча-Сялянскую Міліцыю і Крымінальны Вышук БССР. (З. З. БССР—1930 г. № 16, арт. арт. 110 і 111).

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. Гнілякевіч.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР Б. Вансоўскі.

15 ліпеня 1931 г.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену арт. 101-а і абзацу другога арт. 164 Крымінальнага Кодэксу

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК Саюзу ССР за 3 чэрвеня 1931 г. «Пра зьмену заканадаўства Саюзу ССР у сувязі з рэарганізацыяй Рабоча-Сялянскай Міліцыі», (З. З. СССР 1931 г. № 36, арт. 263) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Запісаць арт. 101-а Крымінальнага Кодэксу ў наступнай рэдакцыі:

«101. а) самавольнае пакіданьне службы службовымі асобамі месц зьняволеньня, на якіх пашыраецца палажэньне аб службе ў мясцох зьняволеньня БССР, выключае.

Пазбаўленьне волі да шысьці месяцаў».

2. Абзац другі арт. 164 Крымінальнага Кодэксу БССР запісаць у наступнай рэдакцыі:

«Вайсковымі злачынствамі лічацца таксама накіраваныя супроць устаноўленага парадку нясеньня службы злачынствы працаўнікоў страявога і адміністрацыйна-гаспадарчага складу ваенізаванай аховы і ваенізаванай пажарнай аховы прадпрыемстваў і пабудоў, якія маюць дзяржаўнае значэньне, а таксама работнікаў аперацыйна-страявога і адміністрацыйна-гаспадарчага складу Рабоча-Сялянскай Міліцыі».

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. Гнілякевіч.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР Б. Вансоўскі.

15 ліпеня 1931 г.

г. Менск.

Апартуністычнай сьпячцы Віцебскага ТСТ пакласьці канец

На сёньняшні дзень у Віцебскім транспартна - спажывецкім таварыстве пералому ў рабоце яшчэ няма. Адозва ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу абгаворвалася на паседжаньні праўленьня і бюро партячэйкі якія вынесьлі пастанову аб перабудове толькі аддзелу грамадзкага харчаваньня не гаворачы ні аб адным іншым аддзеле, ні аб спэцыялізацыі магазынаў, і аб прыгарадных саўгасах і інш. Але адзіная пастанова праўленьня аб вылучэньні ў пасасобную адзінку аддзелу грамадзкага харчаваньня таксама ня выканана. Да шырокіх мас рабочых і служачых адозва ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу не даведзена і работа працягваецца па старымцы.

Гэтай апартуністычнай сьпячцы Віцебскага ТСТ неабходна зараз-жа пакласьці канец.

Брыгада «Сав. Бел.—С. Міркін, Н. Дворсон.

Транспарт ёсьць, а лес ня вывозіцца

Месячнік лесавывазкі па Капыскім раёне пад пагрозай зрыву.

Раённыя арганізацыі не ўзяліся за правядзеньне ўдарнага месячніка. Заданьні дадзеныя па вывазцы ня выкананы. Пастанова ЦКК НК РСІ аб тым, каб, уся вольная рабочая і цягавая сіла як у калгасах так і ў аднаасобных гаспадарках была накіравана на лесазагатоўкі і лесавывазкі не акцыцыяўляецца.

У шмат якіх калгасах Капыскага раёну ёсьць вольная рабочая і цягавая сіла, але з прычыны таго, што з боку Райкалгассаюзу не дадзена як калгасам, так і аднаасобным гаспадаркам, кантрольных лічбаў па вывазцы лесу, яна не накіравана на лесазагатоўкі.

Райкалгассаюз у баку ад лесавывазак, ён не мабілізаваў калгасы на пасьпяховае правядзеньне месячніка лесавывазкі.

Ударнік.

1-ы польскі дзяржаўны тэатр Украіны ў Менску

Учора ў Менск прыехала трупа ў складзе 60 асоб артыстаў 1-га польскага дзяржаўнага тэатру Украіны.

На вакзале артыстаў спаткалі прадстаўнікі прадпрыемстваў, прафсаюзных і савецкіх арганізацый, якія горача віталі брацкі нацыянальны па форме і пралетарскі па зьмесьце—польскі тэатр УССР.

Прадстаўнікі прадпрыемстваў і праф арганізацый, перадаючы ад пралетараў Менску шчырае прывітаньне 1-му польскаму дзяржаўнаму тэатру Украіны, выказалі надзею, што польскі тэатр, адлюстроўваючы на сцэне нашае сацыялістычнае будаўніцтва, выкрываючы балячкі ў нашай рабоце, будзе змагацца за агульную справу ўсёй нашай пралетарскай грамадзкасьці за сацыялістычнае будаўніцтва, за пяцігодку ў чатыры гады, за ленінскую нацыянальную палітыку.

Прадстаўнік калектыву артыстаў 1-га польскага дзяржаўнага тэатру Украіны ў сваім адказе на прывітаньні, запэўніў, што «пастаўленыя камуністычнай партыяй задачы перад тэатрам мы выконвалі, выконваем і будзем выконваць надалей з усёй рашучасьцю».

Няхай жыве ленінская нацыянальная палітыка, якая забясьпечвае бурны рост нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце культуры ўсіх нацыянальнасьцям Саюзу ССР!

Прыгавар па справе цкаваньня ўдарніцы Маткевіч

Газэта «Савецкая Беларусь» нядаўна зьмясьцила матар'ял аб вылазцы кіясавага ворага на барацьбітыта ... апрацоўчым камбінатаце «Камінтэрн».

Гэтымі дн... адбыўся суд над цкавальнікамі ўдарніцы Маткевіч. Пастановай суду Парчонак і Клімковіч прыгавораны да 6 год пазбаўленьня волі, Прылуцкі—да 4 год; Загадчык капыльнага цэху Бакун і загадчык вытворчасьці фрэзэрнага цэху Агафонаў—на паўтары гады пазбаўленьня волі кожны. Тэхнічны сакратар заўкому Каваленка ,які на працягу некалькіх дзён марынаваў матар'ял на цкаваньні тав. Маткевіч, замест таго, каб накіраваць яго ў пракуратуру, і старшыня цэхавага камітэту Краснажонаў прыгавораны да 6 месяцаў прымусовых работ кожны.

Рабочая грамадзкасьць з задавальненьнем вітала прыгавар суду.

У в. Агародня-Гомельская (Церахаўскі раён) насельніцтва на будаўніцтва школы сабрала па самаабкладаньні 15.000 руб. Трэба толькі дабудаваць школу, а сельсавет за гэту справу не бярэцца. Работнікі сельсавету: старшыня і яго намесьнік замест работы займаюцца п'янкай.

Праежджы.

Зрываецца будаўніцтва школы ў в. Сьвятое (Рагачэўскі раён). Дагэтуль яшчэ ня вывезена з лесу больш 50 пр. лесаматар'ялу, а вывезены матар'ял не абкораны. Ніхто не клапоціцца аб тым, каб вывезьці абтаці лес, не загатаўляюць іншых матар'ялаў.

Час ідзе, а будаўніцтва не пачынаецца.

Д.

Рагачэўскія піянэры па-ўдарнаму рыхтуюцца да райзьлёту

(Рагачэўскі раён).

Падрыхтоўка па атрадах і зьвяньнях Рагачоўскага раёну разгорнута як па горадзе, так і па вёсках. Высланы брыгады ва ўсе калгасныя і вясковыя атрады, якія мабілізавалі ўсю піянэрскую, камсамольскую і грамадзкую масу для падрыхтоўкі да райзьлёту і выкананьня сац. умоў, заключаных піянэрскімі арганізацыямі БССР.

Брыгады, якія былі высланы па атрадах, праверылі склад піянэраважатых, слабых замянілі больш моцнымі. Але на сёньнешні дзень у радзе атрадаў склад піянэраважатых нездавальняючы. У вясковых і калгасных атрадах зарганізаваны брыгады для поліва гародаў, таксама арганізаваны сыгнальныя пасты з дзеткораў на час уборачнай кампаніі і брыгады для агляду падрыхтаванасьці ўборачных машыны, хутчэйшай дастаўкі іх на поле і забесьпячэньня змазачнымі матар'ялам.

Піянэратрады ўзяліся за праверку становішча акцябрат і за дапамогу ім у рабоце і за выкананьне пастаноў зьезду камсамолу аб уцягненьні 100 проц. рабочых, батракоў і калгасьнікаў у піянэр'арганізацыі, у выніку чаго лік піянэраў і акцябрат за час падрыхтоўкі да зьлёту значна павялічыўся. З боку РК ЛКСМБ і РБ ДКО заказан пераходны сьцяг, які на райзьлёце будзе перададзены той піянэрбазе ці атраду, якія лепш выкананюць сац. умовы і правядуць падрыхтоўку да райзьлёту.

Уся работа ў атрадах па падрыхтоўцы да райзьлёту праводзіцца пад лёзунгам сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пад лёзунгам барацьбы за пераходны сьцяг.

Мабілізаваны ўсе дзеткоры гораду для правядзеньня рэйду па праверцы ходу падрыхтоўкі да другога райзьлёту ў піянэратрадах і ячэйках КСМ.

Фрумкін, Гурэвіч.

Да 20 ліпеня—ніводнага га няўбранай сенажаці

Шырокім укараненьнем зьдзельшчыны і пастаноўкай вучоту работы перадавых калгасы Крупскага раёну дабіліся поўнага скончэньня сенааборкі

Да ўсіх арганізацый АСО-Авіяхіму

Вялікія посьпехі ў галіне выкананьня плянаў вызначаных партыяй ўладаю ў веснавую сяўбу сеяніц асноўнай задачай у часе ўборачнай кампаніі замацаваньне дасягнутых посьпехаў, далейшы рост сацыялістычнага сэктару, уцягненьне новых бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы.

Вялікія дасягненьні ў галіне будаўніцтва саўгасаў, калгасаў, МТС, ажыцьцяўленьне калектывізацыі і ліквідацыя кулацтва, як клясы забясьпечваюць моцную базу для выкананьня задач пастаўленых перад уборачнай кампаніяй.

Выклік Перакопскай дывізіі аб арганізацыі варашылаўскага суботніка па ўборцы ўражаю павінен ахапіць і 300-тысячную беларускую арганізацыю Асоавіяхіму.

ЦС Асоавіяхіму БССР надаючы асаблівае значэньне ўдзелу арганізацый Асоавіяхіму на ўборачнай кампаніі, прапануе ўсім арганізацыям Асоавіяхіму цалкам і поўнасьцю ўключыцца ў пачын Перакопскай дывізіі па арганізацыі правядзеньня варашылаўскага суботніка.

Ячэйкі Асоавіяхіму да правядзеньня варашылаўскага суботніка павінны арганізаваць ударныя брыгады, дабраахвотныя атрады па ахове сацыялістычнага ўраджаю ад школьнікаў сельскае гаспадаркі.

Кажны асоавіяхімавец павінен прыняць самы актыўны ўдзел у правядзеньні варашылаўскага суботніка.

Адказны сакратар ЦК Асоавіяхіму БССР Смолік.

Інструктар с. г. сэктару Маркавец.

Аднаасобнікі дапамагаюць саўгасу „Каменка" ў сенааборцы

У саўгасе «Каменка» (Крупскі раён) уборка сена праходзіць сапраўды ўдарнымі бальшавіцкімі тэмпамі. На дапамогу саўгасу ў сенааборцы прышлі аднаасобнікі суседніх вёсак. Такія вёскі, як Баравая, Бярозаўка, Старасладодка, Лазаўка аказалі саўгасу асабліва значную дапамогу. Саўгас ужо канчае сенааборку. За ім канчаюць уборку сена шмат якія перадавыя калгасы Крупскага раёну.

Напрыклад калгасы «Чырвоны Араты», «Чырвоны Востраў» ужо поўнасьцю скончылі сенааборку і зараз рыхтуюцца да сустрэчы ўборкі збожжа. Гэтыя калгасы яшчэ з вясны правільна арганізавалі ў сябе працу, перайшлі на зьдзельшчыну і завялі сталы вучот работы ў працаднёх. У часе сенааборкі паміж брыгадамі было шырака разгорнута ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Калгасы спаборнічалі адзін з адным і другім калгасам і саўгасам. Трэба браць прыклад з калгасаў «Чырвоны Араты», «Чырвоны Востраў і з саўгасу «Каменка». Селькор.

Віцебшчына ўбрала толькі 10 проц. сенажацяй

Уборка сена па Віцебшчыне праходзіць вельмі марудна. На 5-га ліпеня па Віцебшчыне павінна быць скошана і ўбрана 20 проц. сенажацяй і канюшны, фактычна-ж убрана толькі 10 проц.

Гарын.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Мендзяржтэатр
СЁНЬНЯ гастроль расійскай оперы пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава
ЯЎГЕНІ АНЕГІН муз. Чайкоўскага
Пачатак а 8 гадзіне
Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк
СЁНЬНЯ ВЯЛІКІ ДНЯЎНЫ ПАКАЗ
Пачатак а 7 гадзіне.
ВЕЧАРАМ
Гастроль эўрапейскіх артыстаў ілюзыяністаў МАРЧЭС.
Дэбют адзінай у СССР трупы акрабатаў сальтоморталістаў Д. Донвальдзі.
Гастроль—ПЯЦЬ ЗРНАЕ—музычны акт.
Першы раз навіна Захаду—аўтамат-лялька—Фрозо.
Працягваюцца гастролі вялісьпядыстаў-фігурыстаў—ПЯЦЬ ПОЛЬДЗІ.
Працяг гастроляй нямецкага атракцыёну 6—РЭДАМ—6
Выезд жокея-наездніка АЛЕКСАНДРА.
Стайня пад кіраўніцтвам А. В Лапіеда
Пачатак гастроляй эквілібрыстаў НАВАРО
Пачатак а 8 гадз. 45 хв. увечары.
Льготныя білеты ў рабкасе

Дом культуры
Гастролі 1-га Дзяржаўнага Польскага Тэатру Украіны
17, 18, 19 ліпеня ГУТА Р. КОБЕЦ
У 3-х дзеях пераклад Вандурскага. Пачатак а 8 з пал. г.
Білеты ў рабкасе, а ў дзень спэктаклю ў доме культуры з 5 гадз.
Прымаюцца заяўкі на цэлевыя спэктаклі.

Кіно „Інтэрнацыянал"
З 13-га ліпеня замежны фільм
Жонка статс-сакратара
Пачатак а 7 гадзіне

Кіно „Пралетары"
З 16 ліпеня ВЯДОМЫ ФІЛЬМ
МАСКА САРВАНА драма ў 7 частках
Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка"
ПЕРШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЬЦЁ
Драма ў 34 эпізодах

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакуманту **1 р.**

БЕЛДЗЯРЖСНАБ

даводзіць да ведама ўсёй кліентуры, што ніжэй пералічаныя аддзяленьні Белдзяржснабу

ПЕРАЙШЛІ НА ПОУНЫ ГАСПАДАРЧЫ РАЗЬЛІК

Па ўсіх пытаньнях, зьвязаных са снабжэньнем, неабходна зьвяртацца толькі непасрэдна ў тое аддзяленьне, у раёне дзейнасьці якога знаходзіцца кліент:

Мейсца знаходжаньня аддзяленьня Белдзяржснабу	№№ к-к рахунку	Раёны дзейнасьці аддзяленьняў
Бабруйск	14	Гарады: Бабруйск, Слуцак, Рагачоў, Жлобін і ўсе раёны б. Бабруйшчыны
Віцебск	308	Гарады: Віцебск, Полацак, Сенна. Гарадок і ўсе раёны б. Віцебшчыны і Полаччыны.
Гомель	15	Гарады: Гомель, Ветка, Добруш, Калінкавічы, Мазыр, Петрыкоў, Рэчыца і раёны б. Гомельшчыны і Мазыршчыны
Магілеў	63	Гарады: Магілеў, Быхаў, Горкі, Клімавічы, Крычаў, Лепель, Мсьціслаў, Ворша, Чавусы, Чэрыкаў, Шклоў і раёны б. Магілеўшчыны і Аршаншчыны
Менск	51/69	Гарады: Менск, Барысаў, Чэрвень і раёны б. Меншчыны

Уся перапіска, якая датычыцца да аддзяленьня, атрыманая дырэкцыяй Белдзяржснабу, а таксама і заяўкі разглядацца ня будуць і будуць накіроўвацца непасрэдна па аддзяленьням

ДЫРЭКЦЫЯ БЕЛДЗЯРЖСНАБУ.

ВІЦЕБСКІ РАБФАК СУВЯЗІ

па падрыхтоўцы ў Ленінградзкі Палітэхнічны Інстытут Сувязі

АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ

на 1, 2, 3 і 4 курсы

Прымаюцца асобы не маладзей 18 год і не старэй 30 год, па сацыяльным становішчы—рабочыя, батракі, калгасьнікі з працоўным стажам ня менш 2-х год, на 4 курс — з 3-хгадовым стажам.

Паступаючыя на 4 курс павінны мець стаж 3-хгадовы.

На аднолькавых правах з рабочымі прымаюцца асобы, якія працуюць на прадпрыемствах сувязі (тэлефаністы, тэл графісты і г. д.) ня менш 3-х год.

Служба ў Чырвонай армії для рабочых, батракоў, калгасьнікаў і работнікаў сувязі залічваецца ў працоўны стаж.

Для асоб, займаючых выбарчыя пасады, працоўны стаж зьніжаецца на 1 год.

Для членаў КП(б) працоўны стаж зьніжаецца на 1 год пры наяўнасьці партстажу.

При ўзросьце ад 18 да 20 год—2 гады.
„ „ „ 21 „ 25 „ —3 „
„ „ „ 26 „ 30 „ —4 „

Для членаў УсеЛКСМ з рабочых, калгасьнікаў, або работнікаў сувязі працоўны стаж зьніжаецца на 1 год пры наяўнасьці 3-хгадовага камсамольскага стажу.

Асобы, якія жадаюць паступіць на рабфак, падаюць заяву ў канцэлярыю рабфаку (Вялікадворская 72/17) з наступнымі дакумантамі:

1. Камандыроўка. 2. Спраўка аб працоўным стажы. 3. Мэтрыка. 4. Анкета, засьведчаная камандыруючай арганізацыяй. 5. Копія вайсковага білету (для мужчын). Калгасьнікі павінны прадставіць даведку аб сямейным і маёмасным становішчы да ўступленьня ў калгас і аб часе ўступленьня ў калгас. 6. Пасьведчаньне аб адукацыі. 7. Пасьведчаньне аб сацыяльным становішчы бацькоў. 8. Пасьведчаньне, што бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў.

За ўсімі спраўкамі даведвацца ў канцэлярыі рабфака (Вялікадворская 72/17) штодзённа ад 10 да 3 гадз. дню і ад 6 да 9 гадз. увечары.

ДЫРЭКТАР РАБФАКУ.

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР і Беларускае аддзяленьне „АБШ"

гэтым паведамляе, што ў горадзе Віцебску

АДЧЫНІЎСЯ **БЕЛАРУСКІ ТЭХНІКУМ**

па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі ў сельскай і лясной гаспадарцы і па вывучэньні хімічнай справы, у які пачаўся набор студэнтаў на 1 курс у ліку 80 асоб, з якіх 40 месц для БССР з выкладаньнем на беларускай мове і 40 месц для Заходняй вобласьці з выкладаньнем на расійскай мове.

Прыём будзе працягвацца да 1 жніўня г. г.

Залічваюцца без іспытаў асобы, скончыўшыя 7-мігодку і іншыя ўстановы адпаведнай асьветы. Правілы прыёму—па даведніку НКАсьветы на 1930-31 навучальны год для паступаючых у ВНУ і Тэхнікумы.

Усе члены ячэек Асоавіяхіму БССР і працаўнікі арганізацый Бел. АБШ жадаючыя паступіць у тэхнікум, пасылаюць на імя прыймовай камісіі пры тэхнікуме свае заявы з адпаведнымі дакумантамі і анкетаю, згодна з патрабаваньнямі даведніка НКАсьветы, па адрасу, г. Віцебск, Пляц Волі. 1.

Правілы прыёму разосланы па райсаветах Асоавіяхіму МІС і РІП арганізацый Бел. АБШ.

Аб залічэньні студэнтам Тэхнікуму, разьмеры вызначанай стыпэндыі і дні яўкі для заняткаў, Тэхнікумам будзе паведамлена асобна.

1—2—3

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР.
Беларускае аддзяленьне „АБШ".

Далёкаўсходняму Краявому Зямельнаму Праўленьню

ПАТРАБУЮЦЦА:

1. Інжынеры мэліоратары—па асушэньні, абвадненьні і водаснабжэньні.
2. Інжынэры—торфмайстры.
3. Аграномы—кармавікі, паляводы, па тэхнічных культурах, машыназнаўцы.
4. Зоотэхнікі: па жывагадоўлі, па сьвінагадоўлі.
5. Інжынэры-будаўнікі.
6. Плянавікі па с-г.

Умовы працы па згодзе, ільготы згодна пастановы ЦВК СССР і СНК ад 12 жніўня (надрукавана ў весьніку НКТ № 31-31), кватэры даюцца.

Заяву накіроўваць па адрасу: Хабаровск, Крайзу сектор кадров.

Д. В. КРАЙЗУ.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе прыгавару Суду ад 12 мая 1931 г. па 196 арт. КК, за парушэньне пастановы СНК аб крэдытнай рэформе абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр Луцкевічу Варфаламею Васільеву

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе прыгавару Суду ад 12 мая 1931 г. па 196 арт КК, за парушэньне пастановы СНК аб крэдытнай рэформе абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне гр. Лунину Абраму Аронаву.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Глаўлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА